Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 12 (5388)
СЕРАДА
15
СТУДЗЕНЯ
1936 г.
Год выдання XIX

ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАЇН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ПАСТАНОВА СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ САЮЗА ССР І ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА ВКП(б)

У сувязі з тым, што **Башкірская** АССР, **Казанская** АССР, **Таджыкская** ССР, **Чэлябінская** і **Данецкая** вобласці, **Паўночна-Каўказскі, Заходне-Сібірскі** і **Краснаярскі** краі выканалі ўстаноўлены для іх Саўнаркомам СССР і ЦК ВКП(б) гадавы план хлебаздачы і забяспечылі сябе насеннем для яравой сяўбы, Совет Народных Камісараў Саюза ССР і Цэнтральны Камітэт ВКП(б) пастанаўляюць:

Дазволіць калгасам, калгаснікам і працоўным аднаасобнікам паіменаваных рэспублік, краёў і абласцей рабіць бесперашкодны продаж свайго хлеба (мукой, зярном, печаным хлебам), кааперацыйным арганізацыям, а таксама на гарадскіх і сельскіх рынках і станцыях чыгунак.

Старшыня Совета Народных Камісараў Саюза ССР
В. МОЛАТАЎ.

Сакратар Цэнтральнага Камітэта ВКП(б)
І. СТАЛІН.

14 студзеня 1936 года.

СОЦЫЯЛІЗМ І КУЛЬТУРА

Пытанні культуры стаяць у цэнтры ўвагі сесіі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта. Пытанні культуры ўзнікаюць папутна пры праходжанні дзяржаўнага бюджэта праз парламенты капіталістычных краін.

Бюджэты ўсіх капіталістычных краін прадстаўляюць карціну нязменнага і няўхільнага зніжэння долі культуры ў агульных выдатках дзяржавы. Аб гэтым гаворыць лічбы, але яшчэ красамоўней гаворыць аб гэтым закрытыя школы. Лік вучнёўства зменшыўся за ўсіх капіталістычных краінах, і гэтага правіла няма выключэнняў, і фашысцкая Германія ідзе наперадзе іншых гасіцеляў культуры. Усюды ўрэзаны выдаткі на школы, што засталіся, на пенсію настаўнікам, на школьнае абсталяванне. Лёс школы раздзяляюць больніцы.

Буржуазная публіцыстыка з усёй бессаромнасцю мракабесся ставіць пытанне аб тым, што культура — гэта роскаш для народу. Культура фігуруе ў капіталістычным бюджэце ў выглядзе мізэрнага прыдатку да ўзбраенняў, да паліцыі, да бюракратыі, да субсідый капіталісту і памешчыку.

У соцыялістычным будаўніцтве культура займае цэнтральнае месца. Яна з'яўляецца і вышэйшай задачай будаўніцтва і асноўным яго сродкам. Гэта не проста «артыкул выдатку», які можна ўрэзваць для фінансавых камбінацый. Гэта душа народнагаспадарчага плана соцыялістычнай краіны.

Калі рабочы клас узяў уладу ў свае рукі, калі ён канчаткова прагнаў імперыялістычных інтэрвентаў і мог, нарэшце, поўнасцю аддаць свае сілы соцыялістычнай гаспадарцы, перад ім паўстала ва ўсёй сваёй гістарычнай вострасці праблема хутчэйшага авалодвання культурай. Аб гэтым нястомна гаварыў вялікі правадыр і настаўнік пролетарыята Ленін. Культуры—вось чаго не хапала пролетарыяту ў гэты важны момант. Яе і не было адкуль браць у адсталай, цёмнай, лезьледзь граматнай царскай Расіі. Завяваць культуру рабочы клас мог толькі ва ўзмоцненай рабоце над самім сабой, пасля таго, як узяў у свае рукі палітычную ўладу.

Аб выніках гэтай работы гаворыць цяперашняя сесія Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта, у строга ўгрунтаваных лічбах выразіўшая ігіанцкі культурны ўздым і росквіт краіны Советаў. Карціна грандыёзная, велічная, захапляючая. Лепшыя людзі совецкай краіны, выбраннікі народу ўпэўнена і спакойна адпускаюць мільярды на новыя школы, новыя клубы, новыя тэатры, павялічваюць сродкі на навуку, на мастацтва, паляпшаюць становішча педагогаў, урачоў, мастакоў, пісьменнікаў, патрабуюць паляпшэння якасці ўсіх сродкаў культурнага развіцця і ў горадзе і ў вёсцы.

Ужо ў 1935 г. будаўніцтва новых школ было яркай, выдатнай з'явай. А будаўніцтва 1936 г. далёка пакідае за сабою мінулы год. 4.300 новых школ за адзін год!

Патрэбны новыя настаўнікі, і выпуск іх расце. Педагагічныя вышэйшыя навуковыя ўстановы, якія навучалі ў 1935 г. 92,7 тыс. студэнтаў, у гэтым годзе будуць рыхтаваць 111 тысяч. Выпуск спецыялістаў па тэхнічных вышэйшых навучальных установах увалье ў армію інжынераў і тэхнікаў усіх галін прамысловасці, транспарту, сельскай гаспадаркі яшчэ 85 тыс. інжынераў і 137 тыс. тэхнікаў.

Кніжная прадукцыя дасць 5.120 мільёнаў аркушаў-адбіткаў супроць 4.300 мільёнаў у мінулым годзе. Новыя выданні твораў Пушкіна і кніг аб Пушкіне разыдуцца па краіне ў колькасці каля 13 мільёнаў экземпляраў. Ніколі ні аб чым падобным і не адважыліся-б падумаць «абаронцы расійскай славеснасці» ў царскай Расіі.

8 тысяч новых тэатраў, кіно, цыркаў і т. д. узнікне ў гэтым годзе. Ці даўно тэатральная трупа была дзівам у калгасным сяле, а ўжо ў гэтым годзе 241 перасоначная трупа будзе абслугоўваць калгаснікаў.

Велізарныя сродкі патрэбны для таго, каб задаволіць гіганцка ўзросшыя культурныя запросы. 17 мільярдаў 638 мільёнаў рублёў адпускае дзяржава па свабоднаму бюджэту на агульнакультурныя патрэбы, і гэта складае прырост у 33,6 проц. у параўнанні з 1935 годам.

Шчодрай рукой совецкая краіна адпускае сродкі на культуру. І якімі мізэрнымі, пагардныміздаюцца дзеячы буржуазных парламентаў, называючыя сябе без усякага права «прадстаўнікамі народу», якія па-зладзейску і блудліва шукаюць, як-бы закрыць яшчэ адну школу, як-бы аграбіць яшчэ тысячу дзяцей і дарослых, асляпіць іх культурна — у інтарэсах аховы дывідэндаў капітала і высокіх міністэрскіх акладаў.

Шматмільённыя масы падхапілі заклік большэвікоў да культуры і яна прышла не толькі з элементарамі, з газетамі, з кнігамі, з школамі, але і з трактарамі, з камбайнамі, з дарогамі, з лямпамі Ільіча. І культурай цяпер пранізан увесь народнагаспадарчы план. Рост прамысловай прадукцыі — гэта рост культуры ў прамысловасці. Рост ураджайнасці — гэта пранікненне культуры ў калгасы. Новы чалавек, асаблівы чалавек, праходзіць праз усе раздзелы народнагаспадарчага плана, і гэты чалавек, які авалодвае не толькі культурай тэхнікі, але і агульнай культурай.

Але як ні велікі нашы поспехі і дасягненні, яны далёка не прадзел, дый няма прадзелу культурнаму развіццю ў соцыялістычнай краіне. Сусветнагістарычныя задачы пастаўлены перад працоўнымі ў прамовах таварыша Сталіна. Паміж фізічнай і разумовай працай праходзяць пільна ахоўваемыя граніцы ва ўсіх буржуазных краінах. Толькі граматнасць у скрамнейшых размерах можа быць удзелена там рабочаму і селяніну. Культура ў капіталістычных краінах — прывілея багатых, іх манаполія, умацаваная пазіцыя іх улады.

Таварыш Сталін заклікае працоўных совецкай краіны знесці без астатку граніцу паміж фізічнай і разумовай працай. Нялёгкая гэта задача, і не за адзін год яна вырашаецца — стаханаўскі рух, які апракінуў нормы, створаныя старой тэхнічнай культурай, служыць заручкай таму, што будзе знесена ў маладым напоры совецкай краіны розніца між людзьмі фізічнай і разумовай працы. У магутным узлёце культуры совецкая краіна ўсяму міжнароднаму пролетарыяту, усяму чалавецтву прадастаўляе неатражальную па сіле сваёй карціну соцыялістычнага трыумфу.

(Перадавы артыкул «Праўды»).

Другая сесія ЦВК СССР VII склікання



На II сесіі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР VII склікання. Таварышы СТАЛІН, МУСАБЕКАЎ, ВАРАШЫЛАЎ і ЛЮБЧЭНКА ў прэзідыуме. Фото КІСЛОВА (Саюзфото).

Спрэчкі па дакладах тт. МОЛАТАВА і МЕЖЛАУКА

РАНІШНЯЕ ПАСЯДЖЭННЕ 13 СТУДЗЕНЯ

У САЮЗНЫМ СОВЕЦЕ

На ранішнім пасяджэнні Саюзнага Совета 13 студзеня старшынствуе тав. **Мусабекаў.** У рабоце Совета прымае ўдзел тав. М. І. **Калінін.**

Першым атрымлівае слова тав. **Ракітаў** — старшыня Заходняга аблвыканкома.

Прадстаўлены на зацвярджэнне сесіі народна-гаспадарчы план 1936 года, хоць гэты план намнога перавышае праграмы ўсіх папярэдніх гадоў, — заяўляе ён, — мы павінны разглядаць як мінімальнае заданне, якое павінна быць перавыканана. У бюджэце сёлетняга года прадугледжана значнае павелічэнне расходаў на соцыяльна-культурнае будаўніцтва і адначасова павелічэнне расходаў на абарону. Гэтыя намёткі цалкам адпавядаюць інтарэсам і патрабаванням усіх працоўных Саюза.

Члены Саюзнага Совета горача апладыруюць гэтай заяве.

Затым выступае нам. старшыні Паўночна-Каўказскага крайвыканкома тав. **Фёдараў.**

Тав. Калінін прадастаўляе слова старшыні ЦВК СССР, старшыні Соўнаркома Закаўказскай федэрацыі тав. **Мусабекаву,** сустрэтаму бурнымі апладысментамі.

Тав. Мусабекаў расказвае аб поспехах прамысловасці і сельскай гаспадаркі ЗСФСР, аб росце транспарту і пабудове новага ўчастка Чорнаморскай дарогі да Сухума.

Тав. **Зімін** — намеснік народнага камісара шляхоў зносін — на яркіх прыкладах паказвае поспехі арміі чыгуначнікаў, узначальваемай тав. Л. М. **Кагановічам.**

Чыгуначнікі ўпершыню прыходзяць на сесію, паспяхова выканаўшы заданую ім праграму. Першыя дні студзеня паказваюць далейшы рух наперад. З 1 па 10 студзеня сутачная нагрузка склала 76.322 вагоны супроць 46 тыс. за той-жа перыяд 1935 года.

11 студзеня чыгункі далі небывалы рэкорд, нагрузіўшы 95 тыс. вагонаў.

Затым выступае старшыня Калінінскага аблвыканкома тав. **Іваноў,** які аддае асаблівую ўвагу праблеме быстрага ўздыму ільнаводчай гаспадаркі вобласці.

Члены Саюзнага Совета цёпла сустракаюць тав. **Левачкіну,** работніцу гомельскага шклозавода, якая перадае гарачае прывітанне сесіі ад імя калектыва завода. Толькі наша краіна адкрыла жаночае шырокую дарогу для творчай дарогі, толькі ў нашай краіне працоўныя жанчыны займаюць камандныя пасты ва ўсіх галінах гаспадаркі. Тав. Левачкіна прыводзіць рад фактаў, якія ілюструюць рост вытворчасці лепшых гатункаў шкла, у асаблівасці люстранога.

Старшыня Варонежскага аблвыканкома тав. **Орлоў** прысвячае сваю прамову задачам соўгасаў і калгасаў у барацьбе за сталінскія 7—8 мільярдаў пудоў хлеба.

Нам. старшыні Данецкага аблвыканкома тав. **Канатоп** гаворыць аб задачах вугольнага Данбаса.

З вялікай прамовай выступае спатканы апладысментамі народны камісар лясной прамысловасці тав. **Лобаў.** Ён гаворыць аб перамозе лясной прамысловасці Саюза, выканаўшай план мінулага года на 108 проц. і аналізуе прычыны гэтага поспеху.

Ад калгаснікаў Калачаўскага раёна, Варонежскай вобласці, перадае прывітанне сесіі ЦВК і таварышу Сталіну калгасніца арцелі «Большевік» тав. **Шапавалава.**

Яна расказвае аб поспехах барацьбы за ўзняцце ўраджайнасці і жывёлагадоўчай гаспадаркі ў раёне.

У часе прамовы тав. Шапавалавай у прэзідыуме з'яўляецца тав. **Молатаў.** Удзельнікі пасяджэння сустракаюць кіраўніка совецкага ўрада бурнай авацыяй, воклічамі «ўра» і прывітаннямі.

Апошнім на ранішнім пасяджэнні Саюзнага Совета выступае старшыня Маскоўскага совета т. **Булганін.** Яго прамова, насычаная красачнымі фактамі барацьбы пролетарыяту і працоўных сталіцы за будаўніцтва соцыялізма, неаднаразова прарываецца апладысментамі.

У СОВЕЦЕ НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ

Ранішняе пасяджэнне Совета Нацыянальнасцей 13 студзеня, якое праходзіла пад старшынствам т. **Г. І. Петроўскага,** было прысвечана працяту спрэчак па дакладах тт. **В. М. Молатава і В. І. Межлаука** аб народна-гаспадарчым плане Саюза ССР на 1936 год.

Першым атрымлівае слова старшыня ЦВК СССР і ЦВК Туркменскай ССР тав. **Айтакаў.**

Апладысментамі сустракае зала паведамленне, што Туркменія ў гэтым годзе першай у Саюзе выканала план паставак хлеба дзяржаве, выканала план вагатовак шоўку, шэрсці і мяса, дабілася прыросту пагалоўя жывёлы на 21 проц.

На узбекскай мове гаворыць старшыня Андыжанскага райвыканкома тав. **Тішабаеў.**

На трыбуне нам. старшыні Соўнаркома Грузінскай ССР т. **Мдывані,** які прысвячае сваю прамову поспехам Грузіі ў розных галінах народнай гаспадаркі.

— Мы, прадстаўнікі нацыянальных рэспублік, гаворым, — заканчвае пад шумныя апладысменты тав. Мдывані, — што пэмент соцыялістычнага будаўніцтва моцна звязаў нас, і калі ў гадзіну іспытання раздасца кліч: «Будзьце гатовы!» мы адкажам: «Заўсёды гатовы, таварыш Сталін!».

Старшыня Соўнаркома Калмыцкай рэспублікі тав. **Пюрбееў** супастаўляе мінулае калмыцкага народу з яго цяперашнім становішчам.

Ад імя калмыцкага народу тав. Пюрбееў пад гучныя апладысменты перадае глыбокую падзяку саюзнаму ўраду і любімаму правадыру тав. **Сталіну** за новае, прыгожае жыццё.

Наступным выступае старшыня ЦВК Арменіі тав. **Мартыкян.**

Аб велізарных гаспадарчых і культурных поспехах Татары гаворыць старшыня Соўнаркома Татарскай рэспублікі тав. **Абрамаў.**

Апошнім на ранішнім пасяджэнні выступае нам. старшыні Соўнаркома Кара-Калпакіі тав. **Логінаў.**

ВЯЧЭРНЯЕ ПАСЯДЖЭННЕ 13 СТУДЗЕНЯ

У САЮЗНЫМ СОВЕЦЕ

Вячэрняе пасяджэнне 13 студзеня пачынаецца з простага і яркага выступлення работніцы Магнітагорскага камбіната тав. Ражковай. Ад імя магнітагорскіх будаўнікоў і эксплаатацыйнікаў яна перадае стаханаўскае прывітанне тав. **Сталіну,** кіраўнікам партыі і ўрада.

У Магнітагорску многа ўчарашніх калгаснікаў і аднаасобнікаў, а тэхніка на камбінаце амерыканская. І вось гэтыя ўчора яшчэ малаграматныя людзі не толькі авалодваюць цяпер складанай тэхнікай, але і перакрываюць праектную магутнасць.

Слова прадастаўляецца народнаму камісару лёгкай прамысловасці СССР тав. **Любімаву,** які сустракаецца доўгімі апладысментамі.

— Упершыню ў 1935 годзе лёгкая прамысловасць справілася з праграмай, дала прадукцыі 102 проц. плана. Гэта — надзвычай важная перамога ўсёй краіны. Рабочыя і калгаснікі прад'яўляюць усё большы попыт на прадметы лёгкай прамысловасці. І лёгкай прамысловасці трэба гэтыя патрабаванні поўнасцю задаволіць. Але мы недавыканалі ўсё-ж праграмы па бавоўне і ільну,—указвае тав. Любімаў.

Што намечана планам сёлетняга года? Павелічэнне выпуску бавоўняных тканін з 2.692 млн. метраў у 1935 годзе да 3.215 млн., шарсцяных тканін — з 80 да 90,5 млн. метраў.

Прывітальнымі апладысментамі сустракае Саюзны Совет тав. **Радзіонаву,** якая перадае прывітанне ад калектыва гарнякоў шахты імя Кагановіча ў Сталінскім раёне Данбаса.

— Учарашнюю Юзаўку сёння не пазнаць. У Сталіно — сталіцы вугальнага Данбаса — новыя дамы, школы, яслі, універмагі. Нічога не асталося ад старога.

Выбух апладысментаў выклікае расказ тав. Радзіонавай аб сённішнім жыцці шахцёраў.

У часе прамовы тав. Радзіонавай за сталом прэзідыума з'яўляецца тав. **Молатаў.** Бурная авацыя. Тав. Радзіонава в трыбуны агалашае «ўра» ў гонар кіраўніка совецкага ўрада, падхватваемае ўсёй залай.

— Няхай папрабуе вораг — усклікае пад апладысменты тав. Радзіонава, — сунуць сваё рыла ў наш совецкі агарод! Мы ўсе будзем абараняць нашу радзіму. Чым больш будзе ў нас вугалю, метала, тканін, золата, тым мацней будзе наша краіна, тым мацней будзе Чырвоная армія. Няхай жыве тав. **Варашылаў!** Няхай жыве родны таварыш **Сталін!**

Затым слова атрымлівае намеснік наркома земляробства СССР тав. **Мураладаў.**

Акадэмік **Графціо** прысвячае сваю прамову праблеме энергетычнага снабжэння Ленінграда.

Наступным выступае тав. **Ларын** — старшыня Азова-Чорнаморскага крайвыканкома.

Доўгімі апладысментамі сустракае зала калгасніцу арцелі імя Дзямчэнка Харкаўскай вобласці тав. **Батрачэнка.** Яна гаворыць на украінскай мове.

— 7—8 мільярдаў пудоў хлеба праз 3—4 гады мы дамо! І як не даць, калі калгасы ўжо сталі моцнымі і багацеюць усё больш. Мы, жанчыны, будзем працаваць усё лепш і лепш. І пад кіраўніцтвам нашага любімага **Сталіна** даб'ем ся новых поспехаў.

Акрамя таго, на вячэрнім пасяджэнні выступалі нарком асветы РСФСР тав. **Бубноў,** калгасніца тав. **Капусціна** (Ленінградская вобласць), тав. **Лазоўскі** і машыніст урубавай машыны тав. **Шышляннікаў** (Кузбас).

У СОВЕЦЕ НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ

На вячэрнім пасяджэнні Совета Нацыянальнасцей першае слова атрымлівае старшыня аблвыканкома Марыйскай аўтаномнай вобласці тав. **Петроў,** які паведамляе аб поспехах вобласці ў розных галінах народнай гаспадаркі.

Затым слова атрымлівае старшыня ЦВК Крымскай АССР тав. **Тархан.**

Вялікія поспехі мае сельская гаспадарка. Мы думаем у гэтым годзе дабіцца ўраджаю пшаніцы не менш 15 пэнтнераў з гектара.

З прамовай выступае старшыня ЦВК СССР і ЦВК УССР тав. **Г. І. Петроўскі,** спатканы бурнымі, доўгімі апладысментамі. Усе ўстаюць. Раздаюцца воклічы прывітання.

На вячэрнім пасяджэнні Совета Нацыянальнасцей акрамя таго, выступалі слесар завода «Красный Профинтерн» (Заходняя вобласць) тав. **Петракоў,** старшыня Мосаблвыканкома тав. **Філатаў,** старшыня ЦВК Якуцкай АССР тав. **Габышэў** і нам. наркома земляробства СССР тав. **Цылько.**

РАНІШНЯЕ ПАСЯДЖЭННЕ 14 СТУДЗЕНЯ

У САЮЗНЫМ СОВЕЦЕ

На ранішнім пасяджэнні Саюзнага Совета, якое адкрылася пад старшынствам тав. **Мусабекава,** скончыліся спрэчкі па дакладах тт. **В. М. Молатава і В. І. Межлаука.** У рабоце Совета прыняў удзел тав. **М. І. Калінін.**

У спрэчках выказаліся тт. **Поднек** (нам. старшыні Усходне-Сібірскага крайвыканкома), **А. І. Рыжаў** (нарком сувязі СССР), **Панкратава** (калгасніца Арзамаскага раёна, Горкаўскага края), **М. М. Кагановіч** (нам. наркома цяжкай прамысловасці СССР), **Сухамлін** (старшыня Дзяржплана УССР).

У СОВЕЦЕ НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ

На ранішнім пасяджэнні Совета Нацыянальнасцей, 14 студзеня, якое адкрылася пад старшынствам т. Г. І. **Петроўскага,** у спрэчках выступілі: акад. **Горын** (Вучоны Камітэт пры ЦВК СССР), тт. **Ерэмін** (нам. наркома лёгкай прамысловасці СССР), **Мінгазава** (старшыня сельсовета, Татарская АССР), **Сейфедзінава** (калгасніца Бахчысарайскага раёна, Крымскай АССР), **Нініцін** (старшыня ЦВК Чувашскай АССР) і **Мамедбекаў** (старшыня СНК Дагестанскай АССР).

***

Абмеркаванне дакладаў аб народнагаспадарчым плане 1936 года закончана. У 2 гадзіны 25 мін. дня, пасля перапынку, адкрываецца сумеснае пасяджэнне Саюзнага Совета і Совета Нацыянальнасцей.

Вялікая зала Крэмлёўскага палаца перапоўнена. У прэзідыуме: тт. **Калінін, Молатаў, Петроўскі, Чубар, Андрэеў, Жданаў, Межлаук, Любчэнка, Чарвякоў, Мусабекаў, Файзула Ходжаеў, Айтакаў, Рахімбаеў, Хрушчоў, Уншліхт, Хацкевіч.**

ЗАКЛЮЧНАЕ СЛОВА тав. МОЛАТАВА

Старшынствуючы тав. **М. І. Калінін** прадастаўляе заключнае слова па дакладах аб народнагаспадарчым плане на 1936 год тав. **В. М. Молатаву.**

З'яўленне кіраўніка совецкага ўрада на трыбуне ўсе прысутныя сустракаюць стоячы, бурнымі воклічамі прывітанняў і крыкамі «ўра».

Тав. Молатаў падводзіць вынікі спрэчак. У сваёй прамове ён спыняецца на асноўных пытаннях народнай гаспадаркі і культуры, прадугледжаных грандыёзным планам 4-га года другой пяцігодкі, і дае чоткую і глыбокую ацэнку прапаноў, унесеных пры абмеркаванні дакладаў у Саюзным Совеце і Совеце Нацыянальнасцей.

Зала напружана слухае.

У спрэчках многія мясцовыя работнікі настойвалі на далейшым хуткім расшырэнні энергетычнай гаспадаркі сваіх краёў, абласцей і рэспублік. Тав. Молатаў гаворыць, што сапраўды народная гаспадарка, культурнасць мас раступ такімі тэмпамі, што пытанне аб электрабудаўніцтве трэба пяпер паставіць ужо значна шырэй, чым яно было пастаўлена ў плане другой пяцігодкі.

Тав. Молатаў пералічвае пытанні, якімі краіна павінна заняцца асабліва сур'ёзна. Перш за ўсё пытанні лясной прамысловасці. Трэба пакончыць са стара-вяскоўшчынай у арганізацыі гэтай галіны гаспадаркі, шырока задаволіць наспеўшы попыт краіны на лесаматэрыялы. Харчовая прамысловасць, якая ў 1936 год увайшла з найбольш высокім перавыкананнем плана за папярэдні год, абавязана значна лепш паставіць задаваленне ўзрастаючых запатрабаванняў спажыўца, укараняць новыя добрыя прадукты сваёй вытворчасці як у горадзе, так і ў вёсцы, выхоўваць у спажыўца добры густ.

Велізарны разгон атрымлівае і лёгкая індустрыя. Для вырашэння тых выключна вялікіх задач, якія пастаўлены перад ёю, трэба дабіцца значнага паляпшэння кіраўніцтва прадпрыемствамі. Тым часам апарат кіравання лёгкай прамысловасці хварэе значнымі бюракратычнымі недахопамі.

Наркаматы павінны стаць вытворча-тэхнічнымі штабамі па кіраўніцтву сваімі прадпрыемствамі. Работа ўсіх наркаматаў будзе правяраца на іх уменні развіваць стаханаўскі рух, кіраваць ім.

Поспехі НКШЗ тлумачацца тым, што кіраўніцтва гэтага наркамата цвёрда выходзіла з правільнай палітычнай устаноўкі, што відаць з разгарнуўшайся барацьбы з «прэдзельшчыкамі», і настойліва імкнулася практычна ператварыць наркамат у вытворча-тэхнічны штаб.

Зала горача рэагуе на прамову тав. Молатава. Частыя ўзрывы шумных воплескаў, шматлікія прывітальныя воклічы паказваюць, што члены ЦВК палкам падтрымліваюць усе вывады заключнай прамовы. Яны горача апладзіруюць, калі тав. Молатаў гаворыць, што стаханаўцы паказуюць новыя цуды высокай соцыялістычнай прадукцыйнасці працы.

Вялікае месца ў сваёй заключнай прамове тав. Молатаў адводзіць пытанням культуры.

Тав. Молатаў гаворыць аб культурна-тэхнічным уздыме рабочага класа, аб росце новых людзей. Нашых новых людзей усё цікавіць, іх цікавіць увесь свет і перш за ўсё соцыялізм. Іх выхавала партыя Леніна—Сталіна, іх кіраўнік, настаўнік і правадыр наш Сталін!

І калі тав. Молатаў упамінае імя натхняльніка і арганізатара перамог соцыялізма — імя тав. **Сталіна,** у зале ўспыхвае грамавая авацыя. Ахопленыя адзіным пачуццём гарачай любві і адданасці свайму правадыру, тысячы людзей, якія запаўняюць велізарную залу, устаюць са сваіх месц. Няма канца воплескам.

Усе прысутныя падхапляюць воклічы: «Няхай жыве наш родны Сталін!».

Больш гадзіны цягнецца прамова тав. Молатава. І калі ён заканчвае сваю прамову словамі ўпэўненасці ў тым, што сесія адобрыць як знешнюю, так і ўнутраную палітыку Совецкага Саюза, магутнае ўра пракочваецца па ўсёй зале. Заключныя словы прамовы тонуць у буры авацый. Раздаюцца воклічы: «Прывітанне кіраўніку совецкага ўрада тав. Молатаву!», «Няхай жыве любімы правадыр народаў тав. Сталін!», «Ура Міхаілу Іванавічу Калініну!».

Слова для прапановы атрымлівае тав. **Любчэнка.** Ён уносіць на зацвярджэнне сесіі праект пастановы па дакладах тт. Молатава і Межлаука аб народнагаспадарчым плане на 1936 год.

Тав. Любчэнка зачытвае першы пункт праекту:

«Адобрыць цалкам і поўнасцю знешнюю і ўнутраную палітыку і практычную дзейнасць урада Саюза ССР».

Гром авацый сатрасае своды залы. Прадстаўнікі народаў соцыялістычнай краіны з велізарным натхненнем выражаюць адабрэнне дзейнасці свайго ўрада.

Новым уздымам воплескаў сустракае сесія другі пункт праекта пастановы — **аб зацвярджэнні прадстаўленага ўрадам народнагаспадарчага плана 4-га года другой пяцігодкі.**

Раздзельным галасаваннем Саюзны Совет і Совет Нацыянальнасцей аднагалосна зацвярджаюць прадстаўлены праект пастановы.

ПАСТАНОВА 2-й СЕСІІ ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА САЮЗА ССР

ПА ДАКЛАДАХ СТАРШЫНІ СНК САЮЗА ССР ТАВ. МОЛАТАВА В. М. І СТАРШЫНІ ДЗЯРЖПЛАНА САЮЗА ССР ТАВ. МЕЖЛАУКА В. І. АБ НАРОДНАГАСПАДАРЧЫМ ПЛАНЕ НА 1936 г.— ЧАЦВЕРТЫ ГОД ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Саюза ССР, заслухаўшы і абмеркаваўшы даклады старшыні Совета Народных Камісараў Саюза ССР тав. **Молатава В. М.** і старшыні дзяржаўнай планавай камісіі Саюза ССР тав. **Межлаука В. І.** аб народнагаспадарчым плане Саюза ССР на 1936 год — чацверты год другой пяцігодкі, — пастанаўляе:

1. Адобрыць цалкам і поўнасцю знешнюю і ўнутраную палітыку і практычную дзейнасць урада Саюза ССР.

2. Зацвердзіць прадстаўлены Советам Народных Камісараў Саюза ССР народнагаспадарчы план Саюза ССР на 1936 год — чацверты год другой пяцігодкі.

Старшыня ЦВК Саюза ССР
М. КАЛІНІН.

Сакратар ЦВК Саюза ССР
І. АКУЛАЎ.

Масква, Крэмль.
14 студзеня 1936 года.

СТАХАНАЎСКІЯ ПЯЦІДНЕЎКІ

У ВІЦЕБСКІМ ПАРАВОЗНЫМ ДЭПО

ВІЦЕБСК. (Кар. «Звязды»). З 8 па 13 студзеня ў віцебскім паравозным дэпо была праведзена стаханаўская пяцідненька.

За час пяцідненькі сярэдняе выкананне норм дасягнула 166,5 проц. Самай высокай прадукцыйнасці працы дабіўся падсобны пэх (майстар Цітаў), выканаўшы сваё заданне на 222 проц.

У падсобным пэху токары тт. **Хацін** і **Панько** выканалі нормы на 300 проц., слесары компасных брыгад тав. **Будзевіч** выканаў норму на 280 проц., тт. **Шалабанаў** і **Дзянісаў** — на 276 проц., каваль **Гельфанд** — 252 проц.

Вылатныя ўзоры работы паказалі машыністы **Мастыко, Зіновіч, Еруцкі, Францаў, Хаткевіч, Гайліч** і **Шанцаў,** якія павялічылі тэхнічную хуткасць да 41,8 кілометраў за гадзіну пры норме ў 30 кілометраў. Апрача таго яны вялі паязды вагой у 1.900—2.500 тон пры норме 1.750. Самы важкі поезд — 2.501 тона — вёў па маршруту Орша — Віцебск машыніст комсамолец тав. **Катнёў.**

А. ЗАРУБЕЖНЫ.

НА АРШАНСКІХ ПРАДПРЫЕМСТВАХ

ОРША. **(Па тэлефону).** Масавым правядзеннем стаханаўскіх змен і сутак адзначылі Дзень ударніка рабочыя аршанскіх прадпрыемстваў. Першая стаханаўская змена была праведзена на адставаўшым да гэтага часу **сілікатным заводзе.** Вытворчае заданне за гэты дзень выканана на 150 проц.

На 206 проц. выканаў заданне завод **«Спартак».** Увечары адбыўся агульны сход рабочых завода. Лепшыя стаханаўцы былі прэміраваны. Стаханаўкі **Сакалоўская, Чысцякова, Бугаёва** і **Карнеенка** атрымалі новыя добра абсталяваныя кватэры.

На **мясакамбінаце** прэміраваны 16 лепшых стаханаўцаў. Стаханаўцы **Пашкевіч** і **Пыхцееў** атрымалі па 500 руб. кожны.

Правядзеннем стаханаўскіх сутак адзначан дзень ударніка на **Асінторфе.** Цэнтральная механічная майстэрня дала 226 проц. сутачнага задання.

Канаўшчык **Аўсюкевіч** даў 348,7 проц. нормы і перакрыў рэкорд ордэнаноснага **Шатурскіх** торфараспрацовак **Зязюліна.**

РЫСКІН.

ДА ВЫНІКАЎ ПРАВЕРКІ ПАРТЫЙНЫХ ДАКУМЕНТАЎ

Сталінская школа партыйнага будаўніцтва

РЭВІНСКІ

Сакратар Магілеўскага райкома КП(б)Б

Каля шасці месяцаў ішла ў нашай партарганізацыі гарачая і небывала напружаная работа па прывядзенню ў парадак нашай партыйнай гаспадаркі. Крапатліва і ўпарта, закасаўшы рукавы, працаваў партыйны апарат, працавалі сакратары партыйных камітэтаў, парторгі і ўсе комуністы, выконваючы загад сталінскага ЦК партыі: «Навесці парадак у нашым уласным партыйным доме».

Уважліва разглядалася кожная партыйная арганізацыя, кожны член і кандыдат партыі, правяраліся партыйныя справы і дакументы, выяўляліся і выкідваліся вон чужыя элементы, неразброіўшыяся контррэволюцыйныя трацкісты, зіноўеўцы, бундаўцы, меншавікі, эсэры і ўсякія прахадзімцы. Абгаворваліся недахопы, рабіліся вывады, намячаліся новыя мерапрыемствы.

Уся партарганізацыя, кожнае яе звяно і паасобныя комуністы праходзілі вялікі практычны курс навучання таму, як трэба ажыццяўляць вучэнне **Леніна—Сталіна** аб партыі, аб партыйным будаўніцтве і кіраўніцтве, як трэба працаваць з масамі і як трэба змагаць за ворагамі партыі і рабочага класа. Выяўляліся новыя кадры сумленных і адданых партыі большэвікоў, якія раней заставаліся незаўважанымі, і перасоўваліся на кіруючыя партыйныя, совецкія і гаспадарчыя пасады.

У канцы снежня вынікі праверкі былі абгавораны на пленуме райкома і ў ЦК КП(б)Б. ЦК КП(б)Б даў нашай арганізацыі большэвікіцяя ўказанні адносна ўрокаў праверкі і далейшай пастаноўкі арганізацыйна - партыйнай і палітыка-выхаваўчай работы.

Якія-ж гэтыя вынікі? Што паказала праверка партдакументаў па Магілеўскай партарганізацыі і што павінны рабіць магілеўскія большэвікі ў бліжэйшым будучым?

У мінулым Магілеў быў губерскім цэнтрам з вялікай колькасцю царскіх чыноўнікаў. Прамысловасць дарэволюцыйнага Магілева складалася з 167 саматужных прадпрыемстваў, у якіх працавалі 652 рабочыя. Насельніцтва Магілева ў большасці складалася з мяшчан, чыноўнікаў, гандляроў і саматужнікаў.

У імперыялістычную вайну тут засела царская стаўка, і Магілеў наваднілі манархічныя, буржуазныя і дробнабуржуазныя контррэволюцыйныя элементы і арганізацыі. І калі ў лютым 1917 года рэволюцыя змяла рускі абсалютызм, Магілеў усё-ж застаўся адным з асіных гнёздаў, адным з цэнтраў контррэволюцыйных сіл. Тут існаваў контррэволюцыйны саюз афіцэрства. Тут на базе кулацкага і мяшчанскага складу насельніцтва дзейнічалі дробнабуржуазныя арганізацыі эсэраў, меншавікоў, напыяналістычныя арганізацыі—бундаўцы і іншыя контррэволюцыйныя групы і групкі. Тут знайшла сабе прытулак карнілаўская контррэволюцыя.

І пасля Кастрычніцкай рэволюцыі ў Магілеве засталося нямала гэтых элементаў. Паасобныя прадстаўнікі гэтага контррэволюцыйнага лагера перафарбаваліся, пранікалі ў рады рабочага класа і нават у рады партыйнай арганізацыі.

Узрослая ў часы першай і другой пяцігодак прамысловасць, хоць і змяніла аблічча Магілева, аднак малады склад рабочых і наяўнасць значнай праслойкі выхадцаў з дробнабуржуазнага асяроддзя патрабуюць ад магілеўскай партарганізацыі надзвычайнай мабілізаванасці, ідэйнай арганізаванасці і ўзброенасці, каб яна магла папярэджваць прасочванне ў рады партыі рознага роду чужакоў.

Гэта своеасаблівасць абстаноўкі павінна была пры праверцы партдакументаў быць улічана і стаць у цэнтры ўвагі магілеўскай арганізацыі. Аднак, бюро райкома ў першы перыяд праверкі не ўлічыла гэтага, і вынікі праверкі былі нікчэмныя. ЦК КП(б)Б быў вымушан адмяніць праведзеную праверку. ЦК па-большэвіцку дапамог нашай партарганізацыі выправіць дапушчаныя памылкі, сапраўды разгарнуць выкрываўчую работу, павысіць пільнасць комуністаў і прыцягнуць іх да актыўнага ўдзелу ў паўторнай праверцы.

Абгаварэнне на сходзе партыйнага актыва і пярвічных арганізацый рашэння ЦК аб адмене праверкі ў магілеўскай арганізацыі з'явілася паваротным пунктам у далейшай праверачнай рабоце.

Класавы вораг, як паказала праверка, выкарыстаў для сваіх шкодніцкіх і падрыўных мэт такую шчыліну, як грубейшае парушэнне статута нашай партыі і нізкую ідэйную ўзброенасць значнай часткі нашай партарганізацыі.

Праверкай выяўлены такія выпадкі, калі прыём у партыю праводзіўся партыйнымі камісіямі нават без зацвярджэння райкомам партыі. За невялікі адрэзак часу—1930—31 гг. — па Магілеўскаму раёну такім парадкам было прынята да 400 чалавек.

Партыйны камітэт шаўковай фабрыкі ў 1932 годзе на адным пасяджэнні ў адзін прысест прыняў у партыю 80 чалавек. Хіба-ж маглі прымаючыя вывучыць як належыць прымаемых?

Статут партыі парушаўся і тым, што ў яе рады прымаліся выхадцы з дробнабуржуазных контррэволюцыйных арганізацый без зацвярджэння Цэнтральнага Камітэта.

Праверка значна ўзняла авангардную ролю комуністаў, павысіла ідэйную ўзброенасць членаў партыі і яшчэ шчыльней згуртавала партыйную арганізацыю вакол ЦК ВКП(б), вакол правадыра нашай партыі таварыша Сталіна. Яна адкрыла для нас вялікія рэзервы партыйных кадраў. У нашай пратарганізацыі выяўлена 130 чалавек зусім падрыхтаваных да вядзення адказнай партыйнай, совецкай і гаспадарчай работы. З совецкай і гаспадарчай работы. З гэтага складу вылучана на партыйную работу 27 чалавек, на совецкую, профсаюзную і гаспадарчую работу — 82 чалавекі і яшчэ ёсць рэзерв, які налічвае 42 члены КП(б)Б.

Нізавыя партарганізацыі шаўковай і швэйнай фабрык, заводаў імя Сталіна, імя Кірава і інш. прадпрыемстваў пачалі лепш падрыхтоўваць і праводзіць партыйныя сходы. На партыйных сходах узрасла актыўнасць. Сходы пачалі праводзіцца больш рэгулярна. Пытанні, якія на іх абмяркоўваюцца, набылі большую палітычную завостранасць. Партыйныя арганізацыі пачалі значна лепш вывучаць комуністаў і ўцягваць іх у актыўнае партыйнае жыццё. Пачаў шырока прымяняцца метад прымацавання больш мocных, падрыхтаваных большэвікоў да палітычна адсталых членаў і кандыдатаў партыі.

Да ліку палітычных вынікаў праверкі трэба аднесці таксама ўзмацненне сувязі партыйнай арганізацыі з шырокімі масамі рабочых і калгаснікаў і паляпшэнне пастаноўкі выхаваўчай работы. Гэта павялічыла рост спачуваючых за гэты перыяд у два разы. Было ў нас спачуваючых 175 чалавек, а на 15 снежня 1935 года — 316 чалавек. Рост спачуваючых ідзе галоўным чынам за лік стаханаўцаў. Колькасць спачуваючых павялічылася асабліва на аўтарэмзаводзе, на шаўковай і швэйнай фабрыках і іншых буйных прадпрыемствах.

У выніку адсутнасці большэвіцкай пільнасці на прапагандысцкую работу былі дапушчаны яўныя ворагі партыі — трацкісты, белагвардзейцы, бундаўцы. Райком прыняў меры да ўкамплектавання сеткі партасветы добрымі кадрамі і да павышэння якасці вучобы. На прапагандысцкую работу былі вылучаны 32 комуністы, праверяныя і тэарэтычна падрыхтаваныя. Сёння сеткай партасветы ахоплена 1.501 чалавек.

Бюро ЦК КП(б)Б, прымаючы акты праверкі па нашай арганізацыі, моцна папярэдзіла нас супроць самасупакоення і зусім правільна ўказала нам на недастатковасць выхавання членаў і асабліва кандыдатаў партыі і спачуваючых, на буйныя недахопы ў пастаноўцы масавай работы, на асабліваё адставанне партыйнай работы ў вёсцы, у навучальных установах і т. д.

У сваёй пастанове бюро ЦК асабліва падкрэсліла, што зрух, якога наша арганізацыя дабілася ў разгортванні большэвіцкай самакрытыкі, яўна недастатковы, што праверка ў нас недастаткова спалучалася з агульным уздымам і ажыўленнем партыйнай работы і ўзнящем ідэйна - палітычнага ўзроўню комуністаў.

Вялікія недахопы маюць партыйныя арганізацыі нашых каапераційных, загатоўчых і гандлёвых арганізацый. Яшчэ вельмі слаба наша кіраўніцтва комсамолам і недастатковая ўвага выхаванню моладзі.

Важнейшай задачай, якая пастаўлена перад намі ЦК КП(б)Б, з'яўляецца тое, каб мы ні ў якім разе не дапусцілі благадушнасці і не прыкрываліся тым, што мы выгналі з партыі многа жулікаў, прахадзімцаў, ворагаў партыі і рабочага класа. Задача заключаецца ў тым, каб накоплены вопыт праверкі партыйных дакументаў замацаваць і ператварыць у пастаянна дзеючы стыль нашай арганізацыйнай і палітычна-масавай работы.

Арганізацыя абавязана прывесці ў поўны парадак партыйную гаспадарку, ва многа раз вышэй узняць большэвіцкую крытыку і самакрытыку, памятаючы, што гэта ёсць выпрабаваны большэвіцкі сродак супроць заспайства, благадушнасці і прытуплення класавай пільнасці. Трэба яшчэ вышэй узняць нашу пільнасць, ідэйна ўзброіць кожнага комуніста, ні на мінуту не аслабляць барацьбы супроць адхіленняў ад генеральнай лініі партыі, у якой-бы форме гэта ні праяўлялася і якой-бы вопраткай гэта ні было прыкрыта.

Бюро ЦК КП(б)Б падкрэсліла, што ў магілеўскай партарганізацыі выключна моцны элементы мяшчанства і дробнабуржуазнай расхлябанасці і таму паставіў перад намі як важнейшую задачу выхаванне комуністаў у духу большэвіцкай прынцыповасці і непрымірымасці да ворагаў партыі, павышэнне ідэйнага ўзбраення комуністаў, рашучую барацьбу з антыленінскімі тэорыямі і далейшае ачышчэнне палітасветнага фронта ад людзей, якія прапягваюць варожую партыі ідэалогію. ЦК абавязаў нас палепшыць апарат райкома, павысіць яго працаздольнасць і яшчэ больш выяўляць і вырошчваць кадры з тым, каб дапамагчы кадрамі іншым сельскім раёнам БССР.

На аснове большэвіцкага ажыццяўлення ўказанняў Леніна—Сталіна, на аснове большэвіцкай рэалізацыі рашэнняў снежаньскага пленума ЦК ВКП(б) і ўказанняў ЦК КП(б)Б магілеўская партыйная арганізацыя зможа ўмацаваць свае рады і ўзняць сваю работу да ўзроўню палітычных задач, якія стаяць перад намі.

ВЯЛІКІ ПАЛІТЫЧНЫ УРОК

Р. І. СОСКІН

Сакратар Аршанскага райкома КП(б)Б

Няма чаго і гаварыць аб тым велізарнейшым значэнні, якое мае праверка партыйных дакументаў у справе ўмацавання радоў партыі. Праверка поўнасцю пацвердзіла ўказанні ЦК ВКП(б) аб тым, што ва многіх партарганізацыях панае свавольства і хаос у партыйнай гаспадарцы, выдачы і хаванні партыйных дакументаў, пастаноўцы ўліку комуністаў, наяўнасці ў многіх партарганізацыях палітычнай блізарукасці і ратазейства.

Падводзячы вынікі праверкі па аршанскай партарганізацыі, патрэбна падкрэсліць, што важнейшым рэзультатам з'яўляецца тое, што партыйная арганізацыя разам з выкрыццём пралезшых у партыю класава-чужых людзей, заклятых ворагаў партыі, навяла парадак у сваім «уласным партыйным доме», вывучыла комуністаў і на гэтай аснове вылучыла многіх новых здольных работнікаў на кіруючую партыйную, совецкую і іншую работу.

У працэсе праверкі выкрыты недахопы і памылкі ва ўнутрыпартыйнай рабоце, і не толькі выкрыты, але ў большасці сваёй знішчаны. Праверка ўмацавала партыйную арганізацыю, павысіла дысцыпліну, адказнасць кожнага комуніста за ўсю партыю, за чыстату яе радоў.

Выяўлены абураючыя факты хаосу і безадказнасці як апарата райкома, так і парткомаў да захавання, выдачы партдакументаў і ўліку комуністаў. Выдача партбілетаў узамен згубленых рабілася па адной толькі заяве і публікацыі ў газеце. Бланкі сапраўдных учотных картак і партбілетаў часта былі даступны каму хочаш. У парткоме Асінторфа знойдзена 17 чыстых бланкаў учотных картак, якія валяліся на сталах, вокнах і ў незамкнёнай шафе. У справах аршанскага папраўчага дома знойдзена 5 партбілетаў. У парткоме мясакамбіната паручалі беспартыйнаму Ткачэнка хаваць партбілеты, якія збіраліся для адзнакі членскіх партыйных узносаў, і ён трымаў іх у сябе месяцамі.

Члены партыі Межаўскага і Яромкаўскага сельсовета — Салавей і Рахманаў, пакінуўшы свае партбілеты беспартыйнаму сакратару сельсовета для адзнакі аб уплаце партыйных узносаў, на працягу двух месяцаў не забіралі іх. У парткоме Белдрэса нават пасля праверкі партдакументаў знойдзена 25 чыстых бланкаў партыйных учотных картак, якія валяліся ў архівах парткома.

Нярэдкі выпадкі, калі ў учотных картках няма адзнакі аб праходжанні работы за цэлае дзесяцігоддзе. За гэтымі, на першы погляд, бяскрыўднымі тэхнічнымі недахопамі ў партыйнай гаспадарцы мелі магчымасць схавацца заклятыя ворагі партыі.

Мы выкрылі групу контррэволюцыйных нацдэмаў у беларэсаўскай пяноўнай сярэдняй школе, на чале якой стаяў «комуніст» Валчкоў. У смалянскім сельскагаспадарчым, аршанскім педагагічным тэхнікуме і на іншых участках культурнага будаўніцтва выкрыты нацдэмы, якія, выкарыстаўшы палітычную блізарукасць кіраўніцтва райана і паасобных звенняў партарганізацыі, займаліся шкодніцтвам на культурным фронце, насаджалі невуцтва.

Гаворачы аб той велізарнай выкрываўчай рабоце, якую правяла партарганізацыя ў сувязі з праверкай партдакументаў, нельга не адзначыць і таго факту, што ў першыя дні праверкі члены бюро РК дапусцілі памылкі, якія заключаліся ў лішняй паспешнасці і неглыбокай праверцы, а ў радзе пярвічных партарганізацый не была забяспечана сапраўды большэвіцкая самакрытыка і выкрываўчая работа. ЦК КП(б)Б падправіў нас, адмяніў праведзеную праверку па партарганізацыі завода «Асінторф» членам бюро райкома КП(б)Б т. Міцьковым і прапанаваў правесці паўторную праверку асабіста сакратару РК. Пасля рашэння ЦК па партарганізацыі Асінторфа бюро РК адмяніла праверку па асобных пярвічных партарганізацыях. Гэта ўнесла рашучы пералом ва ўсю работу па праверцы.

Праверка партыйных дакументаў адыграла вялікую ролю ў справе паляпшэння работы па ідэйна-палітычнаму выхаванню комуністаў. Узнялася зацікаўленасць і адказнасць комуністаў за павышэнне свайго ідэйна-палітычнага ўзроўню, значна палепшылася наведванне заняткаў і якасць партыйнай вучобы.

Цяпер у нас працуюць у горадзе і вёсны 50 партыйных школ і гурткоў.

Склад прапагандыстаў падабраны выключна з праверяных таварышоў, якія маюць пэўную палітычную падрыхтоўку і вопыт партыйнай работы.

Характэрна адзначыць, як адзін са станоўчых рэзультатаў праверкі, такі факт: калі да праверкі і ў першы час праверкі прапагандысты скардзіліся, што мала хто наведвае партгабінет, то зараз назадварот, скардзяцца, што памяшканне не задавольвае, што вельмі многа наведвальнікаў і памяшканне малое. Палепшылася пастаноўка выхаваўчай работы ў комсамольскай арганізацыі. Для кіраўніцтва комсамольскімі палітшколамі райком вылучыў 20 падрыхтаваных членаў партыі, частка якіх яшчэ дадаткова прапушчана праз спецыяльныя курсы.

Значнай частцы комуністаў райком даў заданне ў бягучым навучальным годзе па агульнаасветных прадметах прайсці курс за чатырохгодку. Звыш 50 кандыдатаў будуць прапушчаны праз спецыяльныя курсы пры партгабінеце. Такія-ж курсы для кандыдатаў партыі ствараюцца пры буйнейшых парткомах (Белдрэс, Асінторф, мясакамбінат і інш.). 15 прапагандыстаў, узровень развіцця якіх нездавальняючы, будуць дадаткова прапушчаны праз курсы.

Партмасавая работа, якая разгарнулася ў сувязі з праверкай на прадпрыемствах і ў калгасах, соўгасах, забяспечыла масавае разгортванне стаханаўскага руху і вядучую, авангардную ролю комуністаў, працуючых непасрэдна на вытворчасці. Зараз на прадпрыемствах раёна налічваецца звыш 548 стаханаўцаў і стахановак, паказваючых большэвіцкія ўзоры работы.

Узяць к прыкладу комсамольца токара Гольфарда. Ён дае з дня ў дзень 549 проц. нормы, Мялзвецкі — 300 проц., Лаўрэнцева — 495 проц., Ушакова ўзняла прадукцыйнасць працы да 532 проц., Шак — работніца ільночасальнай ф-кі — стала адна абслугоўваць машыну «Гігант». Яе прыкладу паследавала яшчэ 16 работніц, што ўзняло прадукцыйнасць працы кожнай работніцы да 210 проц., Шалупенка — качагар Белдрэса — перайшоў з абслугоўвання аднаго катла на два, а следам на абслугоўванне 2 катлоў перайшлі яшчэ 4 качагары.

Праверка партдакументаў дала магчымасць глыбока вывучыць кожную пярвічную партарганізацыю і кожнага комуніста не толькі па ўчотных картках і іншых матэрыялах, але шляхам асабістага азнаямлення сакратара райкома са складам партыйных арганізацый. Гэта дало магчымасць глыбей вывучыць ідэйна-палітычны ўзровень комуністаў, іх запросы, вывучыць, у якой канкрэтнай дапамозе мае патрэбу тая ці іншая партарганізацыя для паляпшэння ўнутрыпартыйнай работы. Праверка дала магчымасць лепш вывучыць новыя кадры комуністаў для вылучэння іх на больш адказную кіруючую работу. Яна адкрыла новыя багатыя рэзервы для вылучэння.

У працэсе праверкі райком вылучыў на кіруючую партыйную работу: інструктарамі акругкомаў — 1 чал., на акруговую гаспадарчую работу — 1 чал., інструктароў райкомаў — 5 чал., сакратароў парткомаў — 3 чал., у апарат райкома — 5 чал., прапагандыстамі — 8 чал., на прафсаюзную і гаспадарчую работу — 27 чал.

Для характарыстыкі новых вылучаных кадраў на кіруючую работу можна прывесці некалькі прыкладаў. Тав. Юсічаў — рабочы Белдрэс, член партыі з 1927 г. — вылучан сакратаром парткома мясакамбіната. Ён добра спраўляецца. З дня ў дзень работа ў партарганізацыі камбіната ідзе ўгару. Тав. Баскін, член партыі з 1926 г., вылучан з старшыні сельсовета на работу сакратара парткома буйнейшага ў раёне будаўніцтва ільнокамбіната. Ён таксама з першых дзён паказаў добры ўзор арганізацыі партыйнай работы. Тав. Засценская, работніца ільнокамбіната, мае 9 год вытворчага стажу, член партыі з 1932 г., вылучана старшынёй заўкома гэтага прадпрыемства. На рабоце сябе апраўдвае добра. Корбан — рабочы завода «Чырвоны Кастрычнік», член партыі з 1930 года, вылучан старшынёй заўкома і т. д.

Партарганізацыя мабілізавана, каб да канца выкарчаваць карэнні апартуністычнай благадушнасці і выхаваць кожнага комуніста ў духу большэвіцкай астраты і непрымірымасці да расхлябанасці, ратазейства, да таго, каб статут партыі быў непарушнай цвярдыняй, асновай жыцця партарганізацыі.

Ход падрыхтоўкі да веснавой сяўбы па БССР на 10 студзеня 1936 года

РАЁНЫ	Ачышчана насення: Збожжавых	Ачышчана насення: Ільну	Ачышчана насення: Канапель	Абменена насення гатункова паміж калгасамі: Збожжавых	Абменена насення гатункова паміж калгасамі: Бульбы	Забраніравана кармоў: Моцных	Забраніравана кармоў: Грубых	Засыпана насення траў калгасамі: Шматгадовых	Засыпана насення траў калгасамі: Аднагадовых	Загатоўлена насення траў: Канюшины	Загатоўлена насення траў: Цімафеўкі	Адремантавана трактараў	Выдзелена для ржаўных лаўтарас м	Размерк вана ўраджаю збожжавых па працадзях
1. Прапойскі	100,0	87,7	74,1	55,2	—	17,7	35,6	80,2	40,6	—	—	100,0	32,0	—
2. Чавускі	100,0	93,2	88,8	52,3	—	17,6	92,8	64,8	57,9	—	—	92,6	39,5	—
3. Полацкі	100,0	100,0	100,0	100,0	—	100,7	100,7	36,7	112,4	—	—	69,2	63,9	81,6
4. Жыткавіцкі	100,0	79,5	91,2	—	100,0	8,7	44,9	27,5	28,6	—	—	55,0	2,7	—
5. Хойніцкі	100,0	100,0	100,0	28,7	4,9	34,3	67,3	9,1	79,7	31,6	100,0	90,9	6,1	—
6. Тураўскі*)	100,0	92,0	84,6	—	—	28,2	88,8	—	39,4	—	—	100,0	8,0	—
7. Чырвонаслабодскі	99,3	95,3	100,0	29,5	36,5	48,0	144,2	23,4	58,9	31,1	111,4	73,2	28,8	—
8. Касцюковіцкі	99,0	100,0	100,0	10,5	2,5	17,9	77,8	52,4	83,6	—	—	46,2	73,3	8,8
9. Лоеўскі	98,8	84,9	88,9	—	—	16,5	79,1	37,5	59,0	—	—	—	15,8	—
10. Заслаўскі	97,7	73,0	64,5	68,6	84,9	32,6	53,3	39,1	73,4	3,3	50,0	100,0	36,2	19,7
11. Пухавіцкі	97,5	100,0	100,0	59,4	13,5	37,5	51,1	46,7	22,4	67,6	89,8	84,4	42,9	72,1
12. Чашніцкі*)	96,5	92,2	93,5	19,0	43,0	62,4	96,8	16,9	98,6	—	—	41,4	10,0	—
13. Бярэзінскі	96,2	75,9	64,8	14,1	—	25,1	69,4	32,1	34,0	15,0	50,0	45,0	15,2	—
14. Віцебскі	95,8	84,9	100,0	16,9	—	48,4	87,1	47,8	116,3	15,6	—	59,3	91,8	—
15. Бабруйскі	94,1	66,1	82,5	39,0	50,6	30,0	61,0	52,9	60,9	21,3	96,7	88,5	55,6	—
16. Лепельскі	93,6	91,2	72,7	15,7	18,7	29,4	63,4	0,7	63,4	103,4	—	76,3	66,4	19,2
17. Бешанковіцкі	93,5	90,4	77,5	6,6	—	25,1	100,3	8,5	92,0	—	—	86,5	20,0	—
18. Мазырскі	90,4	85,0	91,6	12,5	7,3	17,5	79,8	24,0	35,6	100,0	—	100,0	27,1	10,8
19. Грэскі	90,0	70,1	62,3	79,7	2,3	32,6	84,2	37,3	99,8	30,9	33,3	100,0	7,7	—
20. Дрыбінскі	89,7	100,0	100,0	—	—	14,8	47,1	32,8	31,6	—	—	100,0	8,3	—
21. Горацкі	89,6	92,8	95,3	5,2	—	26,3	79,0	26,4	51,1	7,5	50,0	100,0	36,6	—
22. Асвейскі	89,2	86,2	—	—	—	16,0	48,8	9,6	67,5	—	—	57,1	69,2	—
23. Дрысенскі	88,5	75,5	—	65,6	—	30,8	57,7	8,6	99,2	26,2	170,0	80,6	57,0	—
24. Чачэрскі*)	88,2	85,1	51,2	—	—	6,0	17,4	6,9	74,6	—	—	93,8	9,1	—
25. Парыцкі	88,0	72,8	65,6	—	—	18,6	49,9	6,3	35,1	—	—	75,0	19,2	57,1
26. Старадарожскі	86,7	84,4	88,5	10,5	82,4	101,1	44,3	69,8	17,5	100,0	—	100,0	37,0	—
27. Смалявіцкі	86,6	85,9	87,9	15,0	12,5	75,5	74,8	77,7	45,0	70,3	120,0	87,5	55,6	16,0
28. Менскі	86,6	100,0	100,0	66,8	19,0	60,9	85,8	76,3	70,8	77,8	170,0	50,8	56,9	9,2
29. Лельчыцкі	86,6	69,7	61,5	—	42,9	9,5	75,4	3,1	28,4	—	—	100,0	26,8	78,1
30. Ветрынскі	86,3	100,0	100,0	61,6	50,8	46,4	98,4	36,0	78,6	—	—	55,0	25,7	—
31. Хоцімскі	85,7	71,4	83,8	10,8	—	19,8	37,8	10,1	87,2	—	—	73,7	90,6	—
32. Любаньскі	85,6	85,7	94,4	45,3	—	19,8	21,3	40,6	19,2	—	100,0	100,0	46,0	63,5
33. Жлобінскі	85,6	80,2	91,7	7,1	3,4	19,0	70,8	18,2	46,4	10,0	—	69,2	29,5	—
34. Дуброўенскі	85,5	68,5	99,2	42,3	83,6	45,1	76,4	20,1	72,4	100,0	100,0	41,0	80,0	4,6
35. Б.-Кашалёўскі	84,4	97,8	95,2	38,1	78,2	46,2	99,9	31,3	58,4	11,4	94,0	100,0	42,2	—
36. Ушацкі	83,7	66,2	65,2	7,0	—	39,2	86,5	21,4	72,3	—	—	65,6	20,7	—
37. Слуцкі	83,2	100,0	100,0	39,7	—	61,6	92,6	19,2	37,3	31,1	20,0	87,0	19,6	—
38. Петрыкоўскі*)	81,6	81,4	80,2	—	—	4,1	28,1	20,8	31,6	—	—	25,0	18,0	—
39. Глускі	81,2	86,1	84,0	12,3	—	35,6	76,8	63,3	29,5	100,0	—	61,1	12,8	—
40. Расонскі	81,2	56,0	76,8	25,6	—	17,1	69,1	5,7	86,6	51,2	—	90,0	8,3	—
41. Ельскі*)	80,5	77,2	81,8	—	—	8,0	54,7	3,8	12,4	—	—	50,0	21,4	—
42. Суражскі	79,2	71,9	73,4	37,5	3,3	23,3	90,6	22,5	93,1	16,7	26,7	46,7	51,4	—
43. Аршанскі*)	78,9	83,5	93,2	38,2	—	30,1	81,8	60,3	90,7	12,0	110,0	27,3	48,0	46,0
44. Дзяржынскі	76,5	95,4	100,0	9,7	9,0	37,4	65,6	70,3	37,0	7,3	100,0	34,5	9,1	—
45. Крупскі*)	76,4	72,5	91,9	82,7	—	52,9	71,7	26,2	56,6	49,3	—	52,2	25,0	16,2
46. Багушэўскі	76,0	83,0	72,9	—	—	22,4	105,5	20,1	87,4	8,0	—	100,0	26,1	37,9
47. Камарынскі	75,7	72,2	80,6	—	—	6,8	15,8	7,5	55,2	—	—	—	12,1	—
48. Бялыніцкі	75,6	84,9	74,8	53,2	10,4	15,2	56,9	31,3	53,9	10,2	—	80,0	12,0	—
49. Церахаўскі	74,8	73,1	94,6	44,7	22,7	31,2	70,5	3,3	51,7	—	—	66,7	50,0	24,7
50. Лёзнянскі	74,3	81,6	92,8	3,2	—	18,6	90,5	54,5	87,0	7,0	20,0	49,3	27,9	—
51. Брагінскі	73,6	86,7	85,9	50,8	—	24,4	61,3	36,0	43,9	100,0	—	—	26,9	4,4
52. Журавіцкі	73,6	92,5	84,7	18,2	26,4	15,4	62,7	6,7	35,4	—	—	—	4,3	—
53. Клімавіцкі	72,9	76,2	73,1	39,9	—	11,9	57,7	23,2	37,5	—	—	55,2	28,6	—
54. Добрушскі	72,6	89,2	96,0	53,5	41,5	29,6	49,2	1,9	42,4	—	—	—	15,6	—
55. Асіпавіцкі*)	72,2	73,7	74,3	22,8	55,7	57,4	55,5	97,6	31,3	140,0	—	50,0	28,6	—
56. Капыльскі	72,0	76,3	81,6	93,2	29,0	56,3	116,1	43,0	72,2	50,0	58,9	100,0	25,0	14,4
57. Шклоўскі	71,6	83,1	90,3	6,1	36,2	17,4	36,6	20,9	42,2	16,7	30,0	65,6	18,9	—
58. Гомельскі	71,1	83,5	73,8	11,2	5,2	20,6	50,5	28,0	50,8	—	140,0	30,8	29,3	—
59. Уваравіцкі	71,0	78,7	69,9	35,4	—	22,0	35,4	22,4	75,0	14,3	—	—	31,2	—
60. Чэрыкаўскі	70,9	59,6	76,0	9,0	—	11,7	37,3	31,9	39,6	109,8	—	40,0	24,2	—
61. Нараўлянскі*)	70,5	98,4	68,5	—	—	18,7	90,0	6,3	17,5	—	—	52,9	62,5	—
62. Свяцілавіцкі	70,1	53,4	73,6	14,6	—	19,6	40,0	4,9	38,2	—	—	—	33,3	—
63. Чырвонапольскі	69,6	74,5	79,7	11,8	—	18,2	47,0	11,3	41,8	—	—	45,0	22,7	—
64. Бягомльскі	69,4	64,7	100,0	20,6	—	28,6	100,2	82,1	55,2	60,0	—	41,7	48,5	—
65. Рагачоўскі	69,4	81,1	73,1	51,5	6,7	23,7	47,5	34,1	53,4	57,5	72,5	88,2	22,7	6,9
66. Плешчаніцкі	68,7	59,0	56,3	58,6	—	24,5	89,1	59,4	39,4	—	—	50,0	25,7	—
67. Сенненскі	68,1	69,3	71,8	34,5	—	21,6	51,3	5,1	82,3	8,6	—	41,7	52,4	2,3
68. Мехаўскі	67,4	57,2	60,0	—	—	23,6	93,0	15,8	70,0	—	—	83,3	—	—
69. Барысаўскі	65,8	55,1	62,2	47,6	—	33,0	108,7	62,9	35,9	35,3	—	42,3	40,5	19,8
70. Магілеўскі*)	65,7	69,5	91,2	6,7	—	23,3	63,4	15,4	41,3	—	—	62,9	35,7	—
71. Капаткевіцкі	62,5	77,8	66,7	—	2,5	22,4	90,5	28,6	10,1	—	—	—	18,0	—
72. Круглянскі	61,9	93,2	100,0	14,0	—	18,1	84,8	15,0	36,0	25,1	65,3	54,2	16,7	2,7
73. Халопеніцкі	61,2	89,4	90,6	97,9	32,3	14,8	31,9	4,2	36,1	40,0	—	100,0	25,0	—
74. Талачынскі*)	59,4	64,6	69,2	23,8	3,7	9,0	31,9	30,5	53,1	50,4	32,3	72,2	10,6	—
75. Смілавіцкі	58,2	51,8	79,8	46,0	—	42,7	116,1	40,1	31,4	14,3	19,9	100,0	21,1	—
76. Лагойскі	57,7	73,4	67,1	34,0	—	24,9	96,7	37,5	59,7	40,9	70,6	100,0	23,9	2,5
77. Гарадоцкі	57,6	67,2	70,0	60,0	—	41,4	116,1	12,5	70,6	47,6	—	75,8	18,5	—
78. Уздзенскі	55,7	92,3	100,0	79,8	100,9	39,0

На нарадзе па ўздыму сельскай гаспадаркі пры ЦК КП(б)Б

ЗА 7—8 МІЛЬЯРДАЎ ПУДОЎ ЗЯРНА

З даклада тав. КАРТУКОВА

Таварыш Сталін на нарадзе камбайнераў высунуў перад усёй краінай задачу — дабіцца ў бліжэйшыя 3—4 гады штогодняй вытворчасці зярна ў 7—8 млрд. пудоў.

Гэта задача ўзнікла і выцекла, як геніяльна і проста растлумачыў нам таварыш Сталін, з росту соцыялістычнай вытворчасці, з росту патрэбнасці народу Совецкай краіны і таму гэта задача, безумоўна, выканальна.

З пастаўленай задачы даваць штогодна 7—8 млрд. пудоў зярна кожная вобласць, кожны край і кожная рэспубліка павінны для сябе зрабіць практычныя вывады, намеціць план павышэння ўраджайнасці на бліжэйшыя гады.

5 снежня ў Маскве была склікана нарада, на якой была прынята пастанова ЦК і Соўнаркома па пытанню аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні калгасаў і аб узнясці сельскай гаспадаркі ў краях, абласцях і рэспубліках нячорназемнай паласы.

Якая канечная мэта гэтай пастановы? Гэта, як вы ведаеце, дабіцца краям і абласцям нячорназемнай паласы, значыцца і БССР, у 3—4 гады 90—100 пудоў ураджаю зернавых у сярэднім, 4—5 цэнтнераў з гектара ільнавалакна, бульбы 900—1100 пудоў з гектара.

Асноўныя недахопы нячорназемнай паласы, аб якіх гаворыць ЦК ВКП(б) і СНК Саюза ў сваёй пастанове, поўнасцю ўласцівы і нам.

Асноўныя недахопы наступныя: недастатковае выкарыстанне складаных машын і адсутнасць добрых кадраў. Гэта — першае. Потым, невыкарыстанне мясцовых угнаенняў, вельмі нездавальняючая справа з канюшынай, парушэнне сталінскага статута, недастатковае яго правядзенне ў жыццё.

Трактарны парк у гэтым годзе справіўся з планавым заданнем на 101 проц., прычым трэба мець на ўвазе, што норма на трактар у нас мізэрная — 265 гектараў.

Радковая сяўба—адна з неабходнейшых умоў ураджаю. Усёй радковай сяўбы ў зоне МТС у 1935 годзе было 15—20 проц.

Ільноперабілка «ВНІІЛ-5» у сярэднім дала 10 гектараў, замест паложаных ёй 50 гектараў.

Мы ўсе гаворым аб тым, што нам патрэбен севазварот, што мы за севазварот і т. д. Але справа ў тым, што ў нашых умовах канюшына безумоўна будзе рашаць пытанне аб севазвароце, а в ханюшынай у нас справа так абстаіць, што мы з года ў год насенне канюшыны поўнасцю не засыпаем, не купляем, не загатаўляем. На гэты год усяго пакуль загатовілі 27 проц. плана.

Аб торфе мы гаворым ужо не першы год, але торф на палі прасоўваецца ў нас вельмі слаба. У мінулым годзе выканалі ўсяго 20—25 проц. плана. Мы на гэты год намячаем затарфаваць нешта каля 65 тыс. гектараў, а што гэта дае — паказваюць наступныя факты.

Нядаўна Наркамзем БССР узнагароджваў асобных старшынь калгасаў, якія выканалі і перавыканалі заданні па торфу. Вось глядзіце, напрыклад, калгас «Чырвоная армія», Віцебскага раёна, перавыканаў свой план тарфавання, зрабіўшы закладку 2.100 кубаметраў кампосту, у рэзультаце атрымаўся ўраджай аўса 120 пуд. з гектара, бульбы 1.000 пудоў, капусты 2.000 пудоў і бручкі 3.600 пуд. Другі калгас «Луч Советов», Паўлоўскага сельсовета, Кіраўскага раёна. Там у рэзультаце прымянення торфу атрымліваецца ўраджай: 122 пуды аўса з гектара, 102 пуды ячменю, 800 пудоў бульбы, 2.000 пудоў морквы.

Гэтыя факты гавораць аб тым, якія велізарныя магчымасці ў нашых руках знаходзяцца і як мы гэтыя магчымасці ўпускаем.

Застанаўлюся на пытанні, якое адыгрывае рашаючую ролю ў справе арганізацыйна-гаспадарчага ўмацавання калгасаў — сталінскага статута сельскагаспадарчай арцелі. Мы да гэтага часу ў Беларусі зарэгістравалі толькі 81 проц. статутаў.

Вось у Круглянскім раёне да апошніх дзён 5 калгасаў зусім не прымалі статута, нават не прапрацоўвалі яго на сходзе. А што дапускаецца ўжо ў прапрацаваных статутах? Тав. Новікаў — сакратар Круглянскага райкома— 22 снежня рабіў паведамленне ў ЦК аб ходзе рэгістрацыі статута, заявіўшы, што са 142 калгасаў статуты зарэгістраваны ў 137. Праз два тыдні звонім у РВК, пытаем у старшыні — скажы, моў, сумленна, колькі ў цябе зарэгістравана статутаў. Ён адказвае: па сумленню—110. А два тыдні таму назад Новікаў гаварыў—137. Адкуль гэта розніца? Проста райком не ведаў, што робіцца са статутам. А як статуты зарэгістраваны хоць-бы ў тым-жа Круглянскім раёне? Па-першае, статут стандартны, надрукаваны для ўсіх калгасаў. У раздзеле V, у пункце адносна растэрміновак, якія прадастаўляюцца новаўступаючым бясконным і безнасенным, запісана — растэрміноўка прадастаўляецца «на 6 год», замест «да 6 год». Гэта-ж грубейшае скажэнне, а старшыня РВК, увесь прэзідыум рэгіструе і не заўважае гэтай справы. Райком партыі не заўважвае. І ў выніку — скажоны статут гуляе па Круглянскаму раёну.

Вазьміце далей пытанні ўнутрыкалгаснай дэмакратыі, напрыклад, пытанне аб змене старшыні калгаса. І тут вельмі дрэнна. Мы вось нядаўна выбарачна па 250 калгасах выявілі, што да прыняцця статута, г. зн. за 1934 год, змянілася 27 проц. старшынь, а пасля прыняцця змянілася 14 проц. Вось Суражскі раён з мая па даны момант паспеў зняць 34 старшынь, Талачынскі — 40, Бягомльскі — 41, Сенненскі — 42, а Багушэўскі — 44, гэта 35 проц. да складу ўсіх старшынь у раёне; Шклоў змяніў 51 старшыню і т. д. Агульныя сходы ў калгасах яшчэ не сталі сходамі, на якіх калгаснік рашае ўсе сур'ёзныя пытанні свайго калгаса.

Як бачыце, у нас значна больш недахопаў, чым указвае ЦК і СНК у сваёй пастанове.

Я не буду пералічваць, колькі нам далі новых МТС і машын, вы ўсе чыталі і ведаеце аб гэтым.

Калі ўзяць цягавую сілу па той колькасці трактараў, якія нам далі, то яна павялічваецца на 30 тыс. адзінак. Гэта вялікая справа. Мы атрымліваем да наяўных 4 тыс. трактараў 2 тысячы новых трактараў.

Пасеўны, уборачны інвентар, машыны — гэта таксама раўняецца 30 проц. таго, што ў нас ёсць. Як бачыце, уводзіцца вельмі салідная дадатковая тэхніка.

Мы атрымліваем новыя машыны — 200 камбайнаў. У нас камбайнаў не было, іх трэба асвоіць. І не так асвойваць, як мы асвойвалі ільноперабілку.

Уводзіцца новая для нас машына — бульбакапалка двухрадковая. Яе на палях яшчэ не было. Гэту машыну таксама трэба ўмець асвоіць, а гэта значыць людзей — кадры трэба рыхтаваць.

Да чаго абавязвае нас ЦК ужо ў 1936 годзе.

Па-першае, да поўнага выкарыстання ўгнаенняў; тут вывазкі гною, торфу, попелу і т. д. Цяпер норма для трактара не 265 гектараў, а 380. Выцерабіць мы павінны машынамі новымі 36 тыс. гектараў, абмалаціць 650 тыс. тон на складаных малатарнях.

Цяпер партыя і ўрад нас абавязваюць к таму, каб мы здолелі ў 1936 годзе залажыць насеннікі канюшыны з тым, каб ужо ў наступным годзе атрымаць тую патрэбнасць насення, якая нам неабходна. Гэта справа сур'ёзная.

Вы ведаеце, што для ўнікнення страт (а гэтыя страты мы заўсёды нясем, у часе ўборкі ў асаблівасці) нас абавязваюць будаваць крытыя павеці, гумны, сушылкі і т. д., г. зн. тое неабходнае, што безумоўна захавае нам значную колькасць зярна ад страт.

Нам трэба правесці рад мерапрыемстваў па сцягванню хутароў, па аб'яднанню дробных калгасаў.

Я ўжо гаварыў вам, што, відаць, вы ўсе пастановы ЦК і СНК абмеркавалі, але ўсё такі ЦК КП(б)Б рашыў склікаць нараду ў такім складзе з тым, каб яшчэ раз добра прадумаць гэту пастанову і практычна намеціць мерапрыемствы на 1936 год.

На рукі разданы праект в параённым размеркаваннем машын і заданняў на 1936 год на аснове пастановы ЦК і СНК. Паступаюць ужо весткі аб тым, што велізарная большасць прысутных тут вітаюць гэтыя прапановы. У асаблівасці, гавораць, раёны рады ўстаноўленай для іх нормай ураджайнасці, усе палаюць жаданнем больш прыбавіць цэнтнераў, усе задаволены размеркаваннем машын і як быццам пярэчанняў адносна гэтага не будзе.

У нашай прапанове ўстанаўляецца ўраджайнасць параённа з разліку 12 цэнтнераў з гектара, прымаемых у сярэднім для зернавых па рэспубліцы. Мы выходзім не з ураджаю мінулага года. За апошні год мы мелі дрэнныя справы з зернавымі. Мы выходзім з рэзультатаў апошніх трох гадоў, у асаблівасці 1933—35 гг., ураджай якіх раўняўся 9 цэнтн. з гектара. Як быццам-бы 12 цэнтнераў невялікая справа, але гэта павышэнне супроць лепшых гадоў на 33 проц. і супроць 1935 года — на 50 проц.

Мы ставім пытанне адносна таго, што ўжо вясной гэтага года мы павінны будзем вывезці не менш 11 тыс. тон гною, затарфаваць 67.500 гектараў зямлі, сабраць толькі за вясну 34 тыс. пудоў попелу.

Я ўжо гаварыў, што радковая сяўба з года ў год правальваецца. У гэтым годзе мяркуецца дабіцца 306 тыс. радковай сяўбы вясной, а ўсяго 620 тыс. гектараў. Значыць, прыдзецца і дырэктару МТС, і сакратару РК, і старшыні РВК карэнным чынам перабудавацца ў адносінах да радковай сяўбы — кожная сеялка ў 1936 годзе павінна быць поўнасцю скарыстана.

Старыя правілы аграмінімума цяпер не падыходзяць. Напрыклад, калі гутарка ідзе аб угнаенні, то гэта ўгнаенне не проста торф і т. д., а тут справа ідзе аб захаванні ўгнаення, аб падрыхтоўцы гэтага ўгнаення такім парадкам, каб яно давала большую эфектыўнасць.

Па зяблеву. Жнівеньскага зяблева амаль няма, вераснёўскага зяблева процантаў 30, а астатняе прыходзіцца на кастрычнік і на лістапад, а гэта-ж дае меншы эфект. План выканалі на 85 проц. і выходзіць, што зяблева па сутнасці справы ў нас мала.

Далей, таварышы, скажу адносна такога ўчастка, як насенне. З добрым-жа чыстагатункавым насеннем у нас вельмі дрэнна. Хіба ў нас вопытная работа па насенню ў калгасах вядзецца? Не вядзецца. Хаты-лабараторыі яшчэ не сталі такім месцам, якое групуе вакол сябе вопытнікаў, навучае, як належыць працаваць.

Засышка насення. Засыпана насення 104 проц. па рэспубліцы. У некаторых-жа раёнах план засыпкі не выкананы. У Круглянскім раёне 91,8 проц. засыпана насення на 1 студзеня, Ельск — 88,6 проц., Капаткевічы — 85,5 проц., Жыткавічы — 85 проц. 21 раён не выканаў плана засыпкі насення. Гэта сведчыць аб дрэннай падрыхтоўцы да вясны 1936 года, да сур'ёзнейшай вясны, якая будзе праверкай работы нашай па-новаму.

Па рэспубліцы мы маем усяго 62 проц. ачышчанага насення на 1 чысло. А вось асобныя раёны як Дрыбін (19,5 проц.), Смілавічы (26 проц.), Быхаў (23 проц.), Даманавічы (38 проц.), а ўсяго 14 раёнаў адстаюць па ачыстцы насення. Я ўжо аб канюшыне не гавару, але калі возьмеш любы паказальнік падрыхтоўкі, то аказваецца, што цэлы рад раёнаў адстаюць на многа, многа процантаў ад сярэдняга рэспубліканскага.

Якія прычыны? Тут прычына адна. Тут справа ў кіраўніцтве, не ўмеюць арганізаваць людзей, забываючы папярэджанне таварыша Сталіна, што «пераход да калектыўнай гаспадаркі, як пераважаючай формы гаспадаркі, не змяншае, а павялічвае нашы клопаты аб сельскай гаспадарцы, не змяншае, а павялічвае кіруючую ролю комуністаў у справе ўздыму сельскай гаспадаркі».

Роля МТС велізарная. МТС, у прыватнасці нашы, беларускія, ужо зараз сканцэнтроўваюць у сваіх руках велізарную матэрыяльную сілу, сканцэнтроўваюць велізарную людскую сілу—кадры. Мы падрыхтоўваем-жа 11 тысяч чалавек, і ўсе пойдуць у МТС.

А што маюць зараз МТС? Маюць дзесяткі тысяч людзей. Гэта велізарная армія і велізарная матэрыяльная сіла.

У нас тут на нарадзе прысутнічаюць лепшыя людзі нашай рэспублікі — 11 чалавек, якія ўзнагароджаны ордэнамі Працоўнага чырвонага сцяга і «Знак почета». **(Апладысменты).**

Гэтыя лепшыя людзі з'яўляюцца перадавікамі ўраджайнасці, людзьмі, якія дасягнулі ва ўмовах Беларусі ўсесаюзных рэкордаў ураджайнасці: 152 пуды, 164 пуды і 175 пудоў з гектара.

Стаханаўскі рух, які пракочваецца зараз па нашай краіне, павінен быць вамі ў МТС узначален, вы-ж павінны кіраваць гэтай справай, бо рух у першую галаву ў МТС разгортваецца. А як вы арганізуеце гэту справу? Слаба. Натуральна, што ў нас людзі растуць слаба, у цэлым радзе месц не растуць таму, таварышы, што дырэктар МТС, або старшы механік, старшы аграном роўнадушна праходзяць, калі трактар засыпаецца снегам, калі на трактар льецца дождж, роўнадушна адносяцца да таго, што ў МТС вялікая запазычанасць. — «Нам, моў, Наркамзем не дае»,—гутаркі няправільныя, бо часта сродкаў няма з-за няўмення ўнутраныя рэзервы выяўляць.

Некаторыя думаюць, што кадры можна выкаваць курсамі. Таварышы, курсы адна справа, але не на курсах расце чалавек, не на курсах ён становіцца ўдарнікам, а ён становіцца стаханаўцам на прадпрыемстве, каля трактара, на трактары. Вось дзе ён расце. А вы думаеце, што вось з курсаў выйдуць у вас выдатныя трактарысты? Не, таварышы.

Гікало. Раскажы, як Ангеліна працуе.

Я да гэтай справы хілю.

Вось я пытаю вас, таварышы дырэктары МТС, калі адбываецца паломка трактара або машыны, то хто за паломку адказвае? Ніхто не адказвае. Я сам быў сведкай таго, як прама, што называецца, псуюць машыну, малатарню. Умовы нашай работы такія, што малатарня часта перасоўваецца, але ніхто не адказвае за перасоўванне малатарні. Калі яна часта перасоўваецца, то патрабуецца ад дырэктара асаблівая ўвага, каб яна не ламалася, не было аварый, а на справе — як зачапілі, так і цягнуць малатарню і яна часта ламаецца.

А вось адносіны брыгады Ангеліной да машыны.

Гікало. Раскажы, хто яны, каб яны ведалі.

Ангеліна — брыгадзір трактарнай брыгады на Украіне. У яе жаночая брыгада, прычым жаночая брыгада выключна з дзяўчат.

Як у іх пастаўлена справа? Ангеліна гаворыць, што яе брыгада 1.200 гектараў і больш выпрацоўвае на трактар. Яна гаварыла на нарадзе, што калі трактарыстка падыходзіць да трактара брудная, я яе на трактар не пускаю, бо калі, моў, ты брудная, то і трактар будзе брудны.

Гікало. Гэта не словы.

Гэта не словы, бо яны, аказваецца, прыехалі на гэты самы з'езд не ў парадным вопратцы, а ў рабочай, а рабочая вопратка гэта была такая, што нашы самыя лепшыя ўдарнікі хадзілі за імі, прыглядаліся і дзіву даваліся, бо сапраўды даяўчаты прыгожа былі адзеты. Яны, аказваецца, у форме. Я думаў, што ў парадным вопратцы — шапачкі такія і ўсё іншае. Яна гаворыць, выбачайце, таварышы, як мы ёсць, так мы і на трактары працуем. І гэта сапраўды не словы. У іх сапраўды так пастаўлена справа, што на трактар брудным не забярэшся, і працаваць даяўчаты ўмеюць, многіх трактарыстаў за пояс заткнулі.

Ясна, што дырэктар МТС, дзе брыгада Ангеліной працуе, не такі, што пройдзе міма непарадкаў, не звярнуўшы ўвагу, умее змагацца з расхлябанасцю, справу ведае, людзей умее вырошчваць, па-культурнаму працуе.

Іменна да гэтага пытання, да пытання аб культурнасці работы МТС мы павінны з вамі вельмі моцна павярнуцца — да культурнай работы МТС. Гэта зусім неабходна, бо калі дырэктары МТС ужо зараз не возьмуцца за тое, каб культурна паставіць работу ў сваёй МТС, то будуць, як і раней, правальвацца.

Асобныя МТС у нас можна паставіць у прыклад.

Вось, скажам, першая Менская МТС, дырэктар тав. Шэлег. Яна ўжо адмовілася ад дзяржаўнай датацыі і вярнула 60 тыс. руб. Рэчыцкая МТС—дырэктар т. Глезіна — 60 тыс. руб., усяго па Бульбакіраўніцтву—8 МТС у нас ужо перайшлі на тое, каб працаваць без датацыі, гэта складае суму ў 295 тыс. руб.

Па Ільнокіраўніцтву 6 МТС — 210 тыс. руб. Па зернакіраўніцтву — 7 МТС — 135 тыс. руб. Ва ўсякім выпадку, таварышы, вы бачыце, што цэлы рад МТС у нас ужо якраз шчыльна падыходзіць да таго, аб чым вельмі моцна нядаўна на нарадзе ў ЦК ВКП(б) гаварылі. Гэта бездэфіцытная работа МТС.

Мне здаецца, таварышы, што дырэктарам МТС (я асабліва налягаю на іх) трэба вельмі моцна зараз заняцца людзьмі, бо кадры-ж вырашаюць усё. Бо людзі павінны асядлаць тэхніку, бо людзі-ж павінны нам у 1936 годзе паказаць рэкордную работу, якой не было да гэтага часу.

Партыйная работа ў вёсцы, у калгасе набывае зараз велізарнейшае значэнне. Ад комуніста, працуючага на сяле, у калгасе, у МТС патрабуецца вельмі многа. Ён павінен быць арганізатарам гаспадаркі з вялікай колькасцю машын, вялікім пасеўным планам Ён павінен быць палітычна і гэарэтычна падкованым, каб ён умеў лепш распазнаваць класавага ворага.

А як у нас гэты комуніст, у большасці адзіночка, жыве і працуе? У нас 4 тысячы адзіночак па Беларусі. Часта гэты адзіночка прадастаўлены сам сабе. А мы-ж павінны зараз, выходзячы з здач, якія перад намі стаяць, узброіць яго, падкаваць, каб ён не быў адзіночкай, каб ён вакол сябе арганізаваў масу людзей, актыў, на які ён мог-бы абапірціся, з якім працаваць, ажыццяўляць кіраўніцтва вялікай гаспадаркай.

Вазьміце спецыялістаў. У нас вялікая колькасць спецыялістаў у калгасах, у МТС. І нашаму комуністу на сяле трэба ўмець працаваць са спецыялістамі, іх арганізоўваць.

Наш комуніст павінен умець падыходзіць да спецыялістаў, павінен дапамагаць ім расці на рабоце.

Партыя патрабуе ад комуніста, каб ён быў кіраўніком буйнай гаспадаркі. Значыць, ён павінен ведаць гэту гаспадарку. Для гэтага трэба яе вывучаць.

Мне здаецца, таварышы, што ў нашы калгасы патрэбна рушыць зараз цэлую армію агітатараў і прапагандыстаў, якія змаглі-б падрабязна расказаць, што ў нас робіцца. Паглядзіце-ж, калі расказаць, як належыць, што робіцца зараз у сценах Крэмля, як правалыры партыі і ўрада прымаюць лепшых людзей, ды расказаць сваёй мовай, па-чалавечку, як належыць, — гэта-ж значыла-б вельмі многа для нашых калгаснікаў, гэта-ж падняло-б цэлую буру стаханаўскага руху, імкнення таксама працаваць, як лепшыя людзі працуюць у Саюзе.

У апошнія месяцы члены-ж Цэнтральнага Камітэта, члены ўрада і таварыш Сталін асабіста прымалі сотні і тысячы перадавікоў прамысловасці і сельскай гаспадаркі і для кожнага з іх яны знаходзілі слова, для кожнага з іх — таварыскія клопаты, цёплая ўвага, уменне запаліць іх энтузіязмам, жаданнем працаваць. І мы ведаем, што удзельнікі гэтых нарад будуць лепшыя байцы на любым фронце, яны ніколі не здадуць.

Задача, пастаўленая таварышам Сталіным,—даць 7—8 мільярдаў пудоў замест 4—5 мілярдаў гэта грандыёзная, зразумелая задача. Гэта задача ніякай іншай краіне не па плячу. Ніякая капіталістычная краіна і думаць не можа аб такіх тэмпах. А нам гэта задача па плячу, бо мы ў Совецкай краіне, наш совецкі народ гэту задачу безумоўна выканае так, як выканаем і мы, беларусы, пастаўленую перад намі задачу—за 3—4 гады дабіцца з гектара 90—100 пудоў зернавых і т. д. Выканаем, таварышы, бо наша краіна — краіна перамогшага пролетарыята, краіна калгаснага ладу, першакласнай тэхнікі, бо наша краіна — гэта краіна вялікага брацтва народаў, бо нашу краіну вядзе ад перамогі да перамогі вялікая комуністычная партыя і такі рулявы, якім з'яўляецца наш вялікі правадыр, любімы друг і настаўнік таварыш Сталін. **(Апладысменты).**

З прамовы тав. ГАРБУЗА

ОРДЭНАНОСЦА, ДЫРЭКТАРА СОЎГАСА ІМЯ КАЛІНІНА МЕНСКАГА РАЁНА

Я тут хачу коратка расказаць, якім чынам соўгас імя Калініна, дзе я працую дырэктарам, дабіўся сваіх выдатных поспехаў. У гэты соўгас я прышоў у студзені 1933 года. Калі падлічылі ўраджай 1932 года, то аказалася, што зернавых узялі ў сярэднім 3,6 цэнтнера з гектара, удой ад каровы складаў 800 літраў, адыход па буйнай рагатай жывёле складаў 33 проц.

У соўгасе імя Калініна я ўзяўся за ўстанаўленне севазвароту, правільнага чаргавання культур. Дакладна вывучыў соўгасную зямлю, вызначыў, дзе будуць якія палі. У 1934 годзе я пасеяў пяць пробных участкаў — з мінеральным угнаеннем, гноем, торфам і іншымі ўгнаеннямі. Вынікі атрымаліся бліскучыя. Я ўжо больш не прадаваў усляную. Ведаў, на якім полі, якое ўгнаенне трэба прымяняць.

Торф, як угнаенне, мае таксама вялікае значэнне. Але ўся справа ў тым, што трэба ведаць, як яго прымяняць. Торф трэба, перш за ўсё, загатаўляць узімку. Мароз вельмі добра выпіскае з яго ўсе кіслоты. Але яго трэба на працягу зімы чатыры-пяць раз пералапаціць. Не дрэнна было-б перасыпаць яго фасфарытнай мукой або вапнай. І зусім добра было-б паліць яго жыжай, якая, трэба прызнацца, вельмі дрэнна выкарыстоўваецца як у калгасах, так і ў соўгасах.

Як вядома, бывае кіслы торф і добры торф, які можна хоць адразу прымяняць. Але самае лепшае было-б, каб капаць гэты торф зімой, як след пералапачваць яго, а калі ёсць магчымасць, скарыстаць у подсціл, а таксама ў кампост.

У нашым соўгасе на плошчы ў 77,75 гектара мы ў сярэднім атрымалі ўраджаю 20,17 цэнтнера з гектара, замест 3,6 цэнтнера, атрыманых у 1932 годзе. **(Апладысменты).** У мяне ёсць некалькі ўчасткаў. На асноўным участку ў 51 гектар я атрымаў па 152 пуды аўса з гектара. На ўчастку ячменю я атрымаў 153 пуды, а ўсяго па ўсёй гаспадарцы я атрымаў у сярэднім: ячменю 125 пудоў, жыта 93 пуды, пшаніцы 70 пудоў.

Рэзка ўзняўся ў нас удой кароў. За мінулы год мы ў сярэднім атрымалі 2.170 літраў. Пагалоўя ў нас 250 галоў. Поўнасцю ўнікнуць адыходу, на жаль, нам не ўдалося — па соўгасу загінула 4 цялят. Тут мы не дагледзелі.

Тав. Бенек у сваім выступленні гаварыў аб севазваротах. Нам трэба абавязкова дабіцца таго, каб у 1936 годзе ўсюды былі поўнасцю ўведзены севазвароты. Трэба нам таксама абавязкова дабіцца, каб да кожнага трактара былі прыцэпшчыкі. Такі пункт мы запісалі ў наш соцыялістычны дагавор на спаборніцтва з Чэрнігаўскай вобласцю. І гэта мае немалое значэнне для павелічэння ўраджайнасці.

Даволі нам прытрымлівацца аграмінімума. Пры аграмінімуме ў нас будзе і ўраджай мінімальны. Нам сур'ёзна трэба ўзяцца за аграмаксімум. І я не сумняваюся, што пад непасрэдным кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б і нашага арганізатора тав. **ГІКАЛО,** пад кіраўніцтвам нашага мудрага правадыра і настаўніка таварыша **СТАЛІНА,** мы вызначаны нам ураджай у 90—100 пудоў за 3—4 гады, безумоўна, возьмем за дваццаць гады. **(Апладысменты).**

З прамовы тав. ГЛЕЗІНАЙ

(ДЫРЭКТАР РЭЧЫЦКАЙ МТС)

Калі мы гаворым аб скарыстанні машын у нас, у БССР, то нават нашы лепшыя МТС нічым асаблівым не могуць пахваліцца. Вось брыгады знатных брыгадзіраў Валошына, якая дала па 1.600 гектараў на трактар, Ангеліной—1.200 гектараў, Гусева і інш. У параўнанні з гэтымі брыгадамі нашы дасягненні яшчэ далёка недастатковыя. Нам патрэбна яшчэ многа папрацаваць, каб дабіцца такіх паказальнікаў у рабоце.

Возьмем нашу Рэчыцкую МТС, якую тут тав. Бенек крыху пахваліў. Праўда, у нас выпрацоўка на трактар у параўнанні з мінулым годам значна павысілася. Мы дабіліся ў сярэднім 360 гектараў на трактар супроць леташніх 110 гектараў. Лічба гэта крыху вышэй сярэдняй па БССР, але ў адносінах да той задачы, якую паставілі ЦК і СНК перад нячорназемнай паласой, яна яшчэ зусім нізкая.

Адносна прычэпнага інвентару трэба сказаць наступнае. У мінулым годзе мы атрымалі 8 «ХТЗ» і 2 «Універсалы», а плугоў да іх не атрымалі. У гэтым годзе мы атрымалі 4 «ХТЗ» і толькі 2 плугі. Дзе-ж яшчэ ўзяць плугоў? Я лічу, што планаваць трэба так, каб разам з трактарамі завозіць і плугі. Тое-ж трэба сказаць аб культыватарах і астатнім прычэпным інвентары.

Тут тав. Бенек гаварыў адносна запраўкі, што ў нас гаручае льюць у трактар прама з бочкі вёдрамі, прычым многа гаручага разліваецца. Гэта адносіцца да ўсіх МТС і асабліва да нашай. Нам патрэбен добры заправачны інвентар. Пытанне гэта неабходна вырашыць Наркамзему БССР.

Цяпер аб ураджайнасці. Калі мы гаворым аб некаторых поспехах у скарыстанні машын, то ў справе ўзняцця ўраджайнасці ў калгасах справа абстаіць значна горш. Мы маем у сярэднім ураджай зернавых па раёну 8,6 цэнтнера з гектара. На некалькі дзесятых цэнтнера ўраджай па зоне МТС вышэйшы.

Вельмі дрэнна абстаіць справа з севазваротамі. Мы праводзілі нарады старшынь калгасаў і сельсоветаў, дзе сур'ёзна паставілі пытанне аб тым, каб у гэтым годзе землеўпараджваць 44 калгасы і ўвесці ў іх севазвароты. Пакуль што ў нас ёсць севазвароты толькі ў 10 калгасах.

Вельмі дрэнна скарыстоўваецца ў нас торф па ўгнаенне. У большасці раёнаў торфам не займаюцца; ён у нас ёсць у вялікай колькасці, а ў ім вялікія запасы, вялікія крыніцы ўраджайнасці. Мы паставілі перад сабой задачу вывезці на працягу гэтага года не менш 35 тысяч тон торфу.

Возьмем, напрыклад, вапну. У нашым раёне, як і ў многіх астатніх, ёсць вялікая колькасць кіслай глебы, якая патрабуе вапнавання. Выхад з гэтага становішча зусім просты: трэба шукаць залежы на месцы. А іх у нас многа. Аднак, справа з даследваннем вапнавых залежаў абстаіць дрэнна. Вясной мінулага года да нас прыехалі супрацоўнікі навукова-даследчага інстытута, знайшлі вялікія залежы вапняковых парод, узялі на пробу і да гэтага часу пробы гэтай зрабіць не могуць.

У 1936 годзе нам трэба па плану забраніраваць насеннікаў канюшыны на 500 гектараў. У нас ёсць іх на 690 гектараў. Значыць, заданне мы выканаем. Але з падсевам канюшыны значна горш. Трэба падсеяць 1.000 гектараў, для чаго патрэбна 160 цэнтнераў насення, а ёсць толькі 14 цэнтнераў. Трэба ўжо зараз клапаціцца аб завозе гэтага насення ў калгасы раёна.

Нарэшце, хачу сказаць аб людзях.

Сярод трактарыстаў у нас ёсць значная група, якая можа даць па 1.000 гектараў на трактар за сезон. Я ўпэўнена, што яны гэта дадуць.

Нядаўна мы склікалі выдатчыя нарады лепшых брыгадзіраў нашага раёна. Сапраўды, з гэтымі людзьмі можна добра працаваць і справу рушыць далёка наперад. Гэтыя людзі адданы справе партыі, справе калгаса, за ўзняцце ўраджайнасці. Калі мы возьмемся як належыць за арганізацыю гэтых людзей, то з тымі задачамі, якія стаяць перад намі па павышэнню ўраджайнасці, мы справімся. **(Апладысменты).**

АБ ПРАВЯДЗЕННІ СПРАВАЗДАЧНАЙ КАМПАНІІ СОВЕТАЎ І ДЭПУТАТАЎ ПЕРАД ВЫБАРШЧЫКАМІ

ПАСТАНОВА ПРЭЗІДЫУМА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА БССР

Прэзідыум ЦВК БССР пастанаўляе:

1. На працягу месяца (з 12 студзеня 1936 г. па гарадах і з 15 студзеня ў сельсоветах) правесці масавую кампанію справаздачнасці советаў і дэпутатаў перад выбаршчыкамі.

2. Асноўным у справаздачнай кампаніі советаў і дэпутатаў павінна быць праверка выканання наказаў выбаршчыкаў і абгаварэнне задач советаў у важнейшай справе разгортвання стаханаўскага руху, далейшага ўсямернага ўзняцця прадукцыйнасці працы, выканання промфінплана, узняцця ўраджайнасці і безумоўнага паляпшэння абслугоўвання патрэб працоўных.

Адной з важнейшых задач справаздачнай кампаніі з'яўляецца ўзмацненне работы советаў, іх секцый і дэпутацкіх груп.

3. Неадкладна ва ўсіх советах неабходна арганізаваць масавую праверку работы советаў праз рэвізійныя камісіі з пастаноўкай на справаздачных сходах дакладаў рэвізійных камісій.

4. Абавязаць АВК, горсоветы і РВК так арганізаваць справаздачную кампанію, каб кожны дэпутат безумоўна адчытваўся перад сваімі выбаршчыкамі.

У адносінах да тых дэпутатаў советаў, хто не апраўдаў давер'е выбаршчыкаў, пасіўна адносіўся да выканання наказу, ужываць пункт Канстытуцыі аб выдзе іх са складу совета, арганізуючы давыбары новых членаў з ліку стаханаўцаў, ударнікаў прамысловасці і сельскай гаспадаркі.

5. Надаючы выключна важнае значэнне справаздачнай кампаніі советаў, дэпутатаў, абавязаць старшынь аквыканкомаў, РВК і горсоветаў, загадчыкаў раённых аддзелаў выехаць у сельсоветы для дапамогі ў арганізацыі справаздачнай кампаніі, а таксама для справаздачных дакладаў аб сваёй рабоце.

6. Абавязаць АВК, горсоветы і РВК арганізаваць пастаянны ўчот справаздачнай кампаніі, дасылаючы ў оргаддзел прэзідыума РВК штодзённыя інфармацыйныя лісты аб ходзе кампаніі.

Абавязаць оргаддзел прэзідыума ЦВК БССР разаслаць у тэрміновым парадку інструкцыйныя лісты аб правядзенні справаздачнай кампаніі і забяспечыць аператыўнае кіраўніцтва гэтай кампаніяй.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР
А. ЧАРВЯКОЎ.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР
М. ЛЯЎКОЎ.

Водгукі замежнага друку на даклад тав. Молатава

ЧЭХАСЛАВАКІЯ

ПРАГА, 12 студзеня. (БЕЛТА). Чэхаславацкі друк аддае выключную ўвагу дакладу тав. Молатава. З асаблівым задаволеннем газеты адзначаюць яснасць, спакой і адначасова рашучасць мірнай палітыкі Совецкага Саюза, якая ў дакладзе тав. Молатава атрымала выключна яркае выражэнне. Перадрукоўваючы падрабязна даклад тав. Молатава ў частцы, датычнай міжнароднага становішча, газеты суправаджаюць яго загалоўкамі: «Нямецкі фашызм пагражае агульнаму міру», «Чырвонай арміяй і дагаворамі з Францыяй і Чэхаславакіяй СССР абараняе мір ад германскай экспансіі».

ФРАНЦЫЯ

ПАРЫЖ, 13 студзеня. (БЕЛТА). Газета «Тан» дае шырокае паведамленне ўласнага карэспандэнта аб дакладзе т. Молатава на сесіі ЦВК. Карэспандэнт падкрэслівае, што «ў сваім агляде адносін Совецкага Саюза з замежнымі дзяржавамі Молатаў захаваў спакойны тон, і яго заўвагі былі ўмеранымі і асцярожнымі. З вялікім энтузіязмам былі прыняты словы т. Молатава аб неабходнасці павысіць асігнаванні на абарону і ўзмацніць работу па абароне. Ні ў якім іншым парламенце свету падобная прапанова не магла-б сустрэць такога прыёму».

Карэспандэнт падкрэслівае, што ўсе прамоўцы, якія выступаюць на сесіі ЦВК, дакладваючы аб дасягненнях сваіх рэспублік і абласцей за мінулы год, безагаворачна адабраюць знешнюю палітыку совецкага ўрада. «Яны падкрэсліваюць, — піша карэспандэнт, — што ўсе народы Совецкага Саюза гатовы ў выпадку неабходнасці аддаць усе сілы на службу радзіме».

«Юманітэ» прыступіла да апублікавання падрабязнай справаздачы аб дакладзе тав. Молатава.

АНГЛІЯ

ЛОНДАН, 12 студзеня. (БЕЛТА). Лонданскія нядзельныя газеты друкуюць на відным месцы тэлеграму, якая змяшчае тую частку даклада тав. Молатава на сесіі ЦВК СССР, у якой гаворыцца аб палітыцы Германіі і Японіі ў адносінах да СССР.

ГЕРМАНІЯ

БЕРЛІН, 12 студзеня. (БЕЛТА). Германскі друк, перадаючы прамову тав. Молатава на сесіі ЦВК, абыходзіць маўчаннем рад істотных пунктаў у той частцы прамовы тав. Молатава, якая закранае совецка-германскія адносіны. У прыватнасці, уніфікаваныя газеты замоўчваюць заяву тав. Молатава аб германскіх прапановах новага буйнага крэдыту і аб беспардонных антысовецкіх імкненнях пэўных кіруючых колаў Трэцяй імперыі.

«Берлінер берзенцайтунг» змяшчае паведамленне аб сесіі ЦВК пад загалоўкам: «Совецкі Саюз і Германія», выдзяляючы тое месца, дзе тав. Молатаў гаворыць аб пасіяновай рэалізацыі 200-млн. крэдыту.

Падрабязны змест прамовы тав. Молатава дае «Франкфуртэр цайтунг», называючы частку прамовы, прысвечаную совецка-германскім адносінам, «цэнтральным пунктам знешнепалітычнай прамовы».

ТУРЦЫЯ

АНКАРА, 12 студзеня. (БЕЛТА). Даклад тав. Молатава на сесіі ЦВК СССР сустрэты ў Турцыі з выключнай цікавасцю. У гутарцы з карэспандэнтам ТАСС відны турэцкія дзеячы, прысутныя ўчора ўвечары на дыпламатычным прыёме ў міністра замежных спраў Турцыі Тэфік Рушдзю Арас, заявілі, што даклад тав. Молатава з'яўляецца бліскучым дакументам палітыкі міру, няўхільна праводзімай Совецкім Саюзам. Вялікае ўражанне зрабіў тут той факт, што заява тав. Молатава аб прыязным характары совецка-турэцкіх адносін суправаджалася бурнымі апладысментамі сесіі ЦВК.

Культурны шэфскі паход

Па вопыту Ўсходне-Сібірскага края, Маскоўскай і Ленінградскай абласцей, у БССР пачынаецца культурны шэфскі паход. У паходзе будуць прымаць удзел відневшыя вучоныя рэспублікі, урачы, педагогі, інжынеры, аграномы, артысты, мастакі і кампазітары.

Цэнтральнае праўленне профсаюза работнікаў вышэйшай школы і Акадэмія навук БССР вылучаюць для ўдзелу ў паходзе звыш 300 акадэмікаў, прафесароў, дацэнтаў і навуковых работнікаў. Яны будуць чытаць лекцыі, праводзіць гутаркі ў калгасах і т. д. Напрыклад, прафесар Замоцін прачытае ў калгасе лекцыі на тэмы «Лев Талстой», «Пушкін», акадэмік Градзінгер — на тэму «Законадаўства аб шлюбе», акадэмік Вальфсон — «Культура будуючагася соцыялізма і загніваючага капіталізма», Краснеўскі — «Творчасць Янкі Купалы», Сняткоў — «Бяздротавая сувязь». 35 навуковых работнікаў Горацкага сельскагаспадарчага інстытута пачалі чытаць у калгасах Горацкага раёна лекцыі па пытаннях уздыму ўраджайнасці, развіцця жывёлагадоўлі і т. д.

У калгасы выедуць каля 300 прафесароў медыцыны і вядзнейшых урачоў, якія прачытаюць лекцыі па медыцынскіх пытаннях. 30 артыстаў і работнікаў мастацтваў выедуць у калгасы для дапамоці ў разгортванні мастацкай самадзейнасці. ЦК ВЛКСМ мяркуе паслаць 200 лепшых культработнікаў, якія дапамогуць наладжванню культурнай работы ў калгасах.

НОВАЕ БУДАЎНІЦТВА Ў МАГІЛЕВЕ

МАГІЛЕЎ, 13 студзеня. (Кар. «Звязды»). У 1936 годзе ў Магілеве будзе пабудован рад будынкаў для культурна-бытавых устаноў, у тым ліку дзве школы. На Лупалаве будзе зроблены 4-паверховы будынак для поўнай сярэдняй школы на 1.000 вучняў. Другі будынак прызначаецца для няпоўнай сярэдняй школы на 500—600 вучняў.

На Лупалаве таксама намечана пабудаваць лазню з прапускной здольнасцю 50 чалавек на гадзіну. Водаправодная сетка ў горадзе будзе пашырана на 4—5 кілометраў.

НОВЫ ЗАКАЗ МАСКОЎСКАГА СОВЕТА

Беларэўны цэх Бабруйскага лесакамбіната, які бліскуча справіўся ў мінулым годзе з пастаўкай акон і дзвярэй для новых сталінскіх школ Масквы, пераключыўся на выкананне новага буйнага заказу Маскоўскага совета. У бягучым паўгоддзі цэх дасць 200 тысяч квадратных метраў акон і дзвярэй для новых будынкаў рэканструюемай Масквы. Падрыхтаваны ўжо да адгрузкі першыя чатыры вагоны будаўнічых дэталяў. Кожныя паўтары мінуты выпускаецца акно і кожныя тры мінуты — дзверы.

Вядомы грузінскі драматург, заслужаны дзеяч мастацтва Шалва Дадзьяні, які прыехаў 13 студзеня ў Менск.

ЗАВОЗ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ МАШЫН

У першым квартале 1936 года Белсельгаспасаб памячае завезці ў БССР сельскагаспадарчых машын на суму 870 тыс. рублёў і запасных частак на 458 тыс. рублёў. Будзе завезена 130 дваццацічатырохдыскавых сеялак, 3.000 плугоў «Сухені-2», 500 зігзагавых борон, 30 бульбасартовак, усяго 29 відаў сельскагаспадарчых машын. Таксама будзе завезена абсталяванне для сельскагаспадарчых прадпрыемстваў на 537 тыс. рублёў, мінеральных угнаенняў — на 435 тыс. рублёў, будаўнічых матэрыялаў для калгасаў і МТС — на 871 тыс. рублёў і сітавых установак для калгасаў — на 96 тыс. рублёў.

БЯГУЧЫЯ РАХУНКІ КАЛГАСАЎ

СЯННО, 14 студзеня. На рахунках калгасаў у Сяннянскім аддзяленні Дзяржбанка знаходзіцца 337 тысяч рублёў супроць 118 тысяч у 1934 годзе. Вялікую цікавасць уяўляе рух сродкаў калгасаў за апошнія два гады. У 1934 годзе на рахункі калгасаў паступіла 1 мільён 22 тысячы рублёў, а ў 1935 годзе — 3 мільёны 400 тысяч рублёў. За хаванне грошай у Дзяржбанку калгасы атрымалі ў 1934 годзе процантаў 9 тысяч 900 руб., а ў 1935 годзе — 17 тысяч рублёў.

А. МАХНАЧ.

ПРОВАДЫ ПЕРАСЯЛЕНЦАЎ У БІРАБІДЖАН

12 студзеня грамадскія арганізацыі Менска праважалі другую партыю перасяленцаў, якія накіроўваюцца на пастаяннае жыхарства ў Яўрэйскую Аўтаномную вобласць. У Біраб'джан выехалі са сваімі сем'ямі 14 лепшых ударнікаў бабруйскай транспартнай арцелі «Чырвоны транспартнік». Разам з імі адпраўлен эшалон з 12 вагонаў гружаных маемасцю перасяленцаў. Перасяленцы атрымалі ад менскіх і бабруйскіх арганізацый шматлікія падарункі — адзенне, абутак, аптэчкі, бібліятэчкі, патэфон, кандэцерскія выробы, цацкі для дзяцей і інш.

НАПЯРЭДАДНІ ЛЕНІНСКІХ ДЗЕН

Напярэдадні ленінскіх дзён ва ўсіх школах БССР адбудуцца гутаркі з вучнямі аб жыцці і рэвалюцыйнай дзейнасці В. І. Леніна. Арганізуюцца ленінскія школьныя вечары. У Беларускай дзяржаўнай бібліятэцы імя Леніна, у Менску, адкрылася літаратурная выстаўка, якая характарызуе жыццёвы шлях і рэвалюцыйную дзейнасць Уладзіміра Ільіча.

НАРОДНЫ ПАЭТ РЭСПУБЛІКІ ЯКУБ КОЛАС У КАЛГАСЕ «НОВЫ ШЛЯХ»

Гэтымі днямі народны паэт рэспублікі Якуб Колас наведаў калгас «Новы шлях», Астрашыцка-гарадзецкага сельсовета (Меншчына). На вечары народны паэт расказаў калгаснікам аб сваім жыцці і творчасці. Калгаснік Сцяпан Міхалевіч, калгасніцы Надзея Васілеўская, Люба Лукашэвіч і іншыя расказвалі аб тым, якія яны чытаюць творы Коласа, чым яны іх хвалююць. Калгаснікі выбралі Якуба Коласа гаданровым членам свайго калгаса і прасілі яго запісаць у мастацкай форме гісторыю калгаса. (БЕЛТА).

СТАХАНАЎКІ СУВЯЗІ

Тэлеграфістка Менскага цэнтральнага тэлеграфа т. Чараповіч, якая працуе на апараце «Бодо», замест 900 слоў за гадзіну па норме перадае 1600 слоў. Тэхнік т. Сяргеева замест аднаго апарата перайшла на абслугоўванне трох апаратаў. Тэлеграфістка віцебскага тэлеграфа т. Бізунова на апараце «Клопфер» замест 500 слоў за гадзіну перадае 1066 і не мае браку ў рабоце.

ВАДАПРАВОДЫ Ў КАЛГАСАХ

У бягучым годзе Наркамзем БССР запраектаваў пабудову ў 20 лепшых калгасах рэспублікі водаправодаў з аўтапаілкамі. У сучасны момант толькі тры калгасы маюць водаправоды з аўтапаілкамі. Апрача таго будзе арганізавана прасцейшая падача вады непасрэдна ў скотныя двары 500 калгасаў.

Газетныя радкі

ПРЫКЛАД ПРАЦОЎНАГА ГЕРАІЗМУ

На паравозе Э-708—18, які стаяў з поездам на станцыі Невель, у топцы праваліліся каласнікі. Не гледзячы на высокую тэмпературу ў топцы, качагар паравоза т. Эдэльштэйн, рызыкуючы жыццём, спусціўся ў топку, каб паставіць каласнікі. На Эдэльштэйне загарэлася вопратка, але ён працаваў датуль, пакуль скончыў работу. Поезд быў адпраўлен своечасова. Профсаюзная арганізацыя віцебскага дэпо прэміравала т. Эдэльштэйна, як аднаго з лепшых качагараў-крываносаўпаў, пуцёўкай на курорт. («Віцебскі пролетарый»).

ЗАВОД МАЛОЧНАЙ КІСЛАТЫ Ў ТАЛАЧЫНЕ.

На тэрыторыі талачынскага крухмальнага завода запраектавана пабудаваць новы завод. Прадпрыемства будзе пераапрацоўваць бульбяную мязгу ў малочную кіслату. («Калгаснік Талачыншчыны»).

СТРУННЫЯ КАЛГАСНЫЯ АРКЕСТРЫ

У калгасах імя Мялешка і «Праўда», Бабініцкага сельсовета (Ветрынскі раён), арганізаваны струнныя аркестры. («Большэвік Попаччыны»).

Стаханавец завода «Пролетарый» імя Кірава (Гомель) ПАВАЛОЦКІ А. Я. з жонкай Соф'яй Сямёнаўнай збіраецца ў тэатр.

Фото СОРКІНА.

СХОД ЧЫГУНАЧНІКАЎ МЕНСКАГА ВУЗЛА

ВЫБРАНА ОРГБЮРО ТАВАРЫСТВА «ЛАКАМАТЫЎ»

12 студзеня адбыўся сход чыгуначнікаў Менскага вузла. На сходзе было выбрана вузлавое оргбюро фізкультурнага таварыства «Лакаматыў». У складзе бюро 9 лепшых стаханаўцаў-спартсменаў. Старшынёй выбраны начальнік вагонарамонтнага завода імя Мяснікова т. Дзічкоўскі, сакратаром — стаханавец гэтага-ж завода т. Хмялеўскі.

Н. СТРЭЛЬЧАНКА.

КОРАТКА

(Ад карэспандэнта «Звязды»).

* **Канцэрты артыстаў Беларускага дзяржаўнага тэатра оперы і балета Александроўскай у Смаленску прайшлі з вялікім поспехам.** У канцэртах таксама прымалі ўдзел артысты тэатра тт. Дзянісаў, Балопін, Жэзнер, Крамарэўская і іншыя.

* **40 новых хат-лабараторый** будзе абсталявана ў першым квартале гэтага года ў калгасах БССР.

* **25 мільёнаў сшыткаў** выпусціць у першым квартале беларускі паліграфічны трэст. Першыя тры мільёны сшыткаў ужо выпушчаны.

* **Таварыская сустрэча па валейболу** паміж камандай Маскоўскага дзяржаўнага акадэмічнага вялікага тэатра і зборнай камандай работнікаў мастацтва Менска закончылася з лікам 2:0 на карысць першай. Ігра каманды ГАБТ са зборнай Менска закончылася з лікам 2:1 на карысць Менска.

* **Зімовыя канікулы** ў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі імя Луначарскага закончыліся 13 студзеня. Ва ўсіх аддзяленнях пачаліся заняткі.

* **Палаўнічыя-капгаснікі** калгасаў Старасельскага сельсовета (Віцебшчына) за прайшоўшы месяц зімняга сезона забілі 215 зайцаў, тры лісіцы і аднаго барсука.

* **Будаўніцтва павільёна тэхнікі** заканчваецца ў менскім парку культуры і адпачынку. У павільёне будуць прадстаўлены экспанаты прадукцыі прадпрыемстваў БССР, узоры работы стаханаўцаў і малелі вынаходстваў.

* **Будаўніцтва дома для знатнай трактарыстки Зоні Рачок** пачалося на сродкі, адпушчаныя капыльскім райвыканкомам.

Тры блізняцы

МАЗЫР. (Кар. «Звязды»). Калгасніца калгаса «Груд», Танежыцкага сельсовета, Тураўскага раёна, Наста Рагавец у мясцовай сельскай больніцы, якая нядаўна адкрылася, нарадзіла трайню — двух дзяўчынак і хлопчыка. Раённы аддзел аховы здароўя выдаў Рагавец адначасовую дапамогу ў размеры 200 руб. і прымацаваў для нагляду за ёй і дзецьмі ўрача.

★

Аднаасобніца Капчэева Ніна з вёскі 1-я Палуж, Чырвонапольскага раёна, 25 снежня 1935 года нарадзіла трох блізняцоў, з якіх дзве дзяўчынкі і хлопчык. Маці і дзеці былі дастаўлены 30 снежня ў раённую больніцу, дзе ім забяспечан медыцынскі догляд. Капчэева і дзеці адчуваюць сябе добра. Райвыканком аказаў мацеры матэрыяльную дапамогу ў суме 300 рублёў.

ФЕДЗІН.

ПАВЕДАМЛЕННІ

16 студзеня 1936 г. у 7 гадзін вечара, у памяшканні Польскага тэатра сканцэнтраецца рэзервная нарада ўсіх комуністаў, працуючых непасрэдна ля заводаў.

15 студзеня 1936 г. у 7 гадзін вечара ў Доме партактыва Менгаркома КП(б)Б (малая зала) адбудзецца інструкцыйны даклад тав. Юрэва для прапагандыстаў і лектараў агітатараў на тэму: «Міжнароднае і ўнутранае становішча» па дакладу тав. Молатава.

Дом партактыва Менгаркома КП(б)Б

17 студзеня 1936 г. у памяшканні клуба працасяўзы (Комуністычная, 19), у 7 гадзін вечара адбудзецца партсход комуністаў-адзіночак Варашылаўскага раёна.

Адказны рэдактар Н. СТЭРНІН.

НАСТУПЛЕННЕ ЯПОНСКІХ ІМПЕРЫЯЛІСТАЎ У КІТАІ

«ІМПЕРАТАР УСЕКІТАЙСКІ»

БЕЙПІН, 12 студзеня. (БЕЛТА). Былы памочнік рэдактара газеты «Манчжурыя дэйлі н'юс», фактычна выдаваемай квантунскай арміяй, прыступіў да выдання новага журнала «Караван», які таксама фінансуецца японскімі коламі. У першым нумары гэтага журнала надрукован перадавы артыкул, азаглаўлены «Імператар усекітайскі». Перадавы настойлівa «раіць» аднавіць манархію ў Кітаі і пасадзіць Пу-І на трон кітайскага імператара.

ПАЎНОЧНЫ КІТАЙ — ДРУГОЕ МАНЧЖОЎ-ГО

ШАНХАЙ, 13 студзеня. (БЕЛТА). Вялікае ўражанне ў мясцовых палітычных колах зрабіла паведамленне з Дайрэна аб падрыхтоўцы японскімі коламі «грамадскай думкі» к аб'яўленню Пу-І кітайскім імператарам, г. зн. к рэстаўрацыі манчжурскай дынастыі Цын (дынастыя Цынаў была скінута рэвалюцыяй 1911 года).

Канчатковая «форма кіравання» адрываемых зараз ад Кітая правінцый яшчэ не выпрацавана, але мясцовыя палітычныя колы не сумняваюцца, што ў бліжэйшы час так званая «незалежнасць» поўначы Кітая будзе поўнасцю афармлена, і новая марыянетачная «дзяржава» будзе народжана тымі-ж, хто парадзіў Манчжоў-Го.

Сур'ёзнае значэнне надаецца тут намерам японскага камандавання ўключыць Шаньдун, правінцыю з 35-мільённым насельніцтвам, у «незалежны» ўрад Паўночнага Кітая. Аўладанне Шаньдунам стварае непасрэдную пагрозу Нанкіну.

Зварачаюць таксама ўвагу на сур'ёзнасць непасрэднай ваеннай пагрозы правінцыі Шаньсі (12 мільёнаў насельніцтва) з боку япона-манчжурскіх войск Лі Шоусіна, ушчыльную стаўшых каля паўночных границ правінцыі ўздоўж Вялікай сцяны. Прыход япона-манчжурскіх войск да границы Шаньсі азначае, што японскае камандаванне цвёрда пастанавіла пашырыць так званы «аўтанамісцкі рух» і на гэту правінцыю.

ЗАХВАТ УНУТРАНОЙ МАНГОЛІІ

БЕЙПІН, 13 студзеня. (БЕЛТА). «Бейпін кронікл» паведамляе, што япона-манчжурскія войскі, захапіўшыя нядаўна 12 паветаў у Чахарскай правінцыі, дайшлі да горада Ваньцюань (на захад ад Калгана) і арганізуюць у захопленых раёнах «новы рэжым». Усе пашпортовыя аддзяленні на занятай япона-манчжурскімі войскамі тэрыторыі спынілі дзейнасць, зносіны паміж паасобнымі гарадамі і вёскамі спыніліся.

***

ШАНХАЙ, 13 студзеня. (БЕЛТА). Англійская газета, якая выдаецца ў Сінгапуры, «Стрэйтс таймс» паведамляе: «Камандаванне квантунскай арміяй у канцы снежня пастанавіла павялічыць свае сілы ў Паўночным Кітаі да 22 дывізій, якія павінны быць раскватараваны ў правінцыях Хебей, Чахар і ў Паўночнай частцы правінцыі Суйюань. Згодна афіцыяльных японскіх даных, 12 дывізій з гэтых 22 будуць японскімі, а астатнія 10 будуць складзены з змешаных мангольскіх і манчжурскіх войск.

КОМУНІСТЫЧНЫЯ ДЭМАНСТРАЦЫІ Ў ВАРШАВЕ

ВАРШАВА, 13 студзеня. (БЕЛТА). Як паведамляюць газеты, учора ў розных пунктах Варшавы адбываліся комуністычныя дэманстрацыі. Дэманстранты агалашалі рэвалюцыйныя лозунгі і ішлі з чырвонымі плакатамі. Праведзены арышты.

ГЕРМАНА-ЯПОНСКІЯ ПЕРАГАВОРЫ

ПАРЫЖ, 13 студзеня. (БЕЛТА). Газета «Жур» у артыкуле аб германа-японскім ваенным дагаворы піша:

«Германскі друк, які так нецярпліва выражае сваё хваляванне па поваду франка-англійскіх ваенных перагавораў маўчыць па поваду берлінскіх перагавораў паміж афіцэрамі японскага генеральнага штаба — з аднаго боку і Рыбентропам і прадстаўнікамі рэйхсвера — з другога. Гэтыя перагаворы былі акружаны глыбокай тайнай, журналістам было забаронена пісаць аб іх. Аднак, сакрэт не ўдалося поўнасцю захаваць, і англійскае пасольства было паінфармавана аб адбыўшыхся перагаворах.

Паводле слоў газеты, Лондан мяркуе, што гэтыя перагаворы прывялі ўжо да канкрэтнай згоды.

Першы беларускі дзяржаўны тэатр БДТ-1 | Сёння, 15 студзеня, ВЕЛІКАДУШША. Пачатак у 8 г. веч. Білеты прадаюцца ў касе тэатра.

Гукавы кінотэатр «Пролетарый» | Амерык. гукавы фільм Чалавек-невідзімка

Гукавы кінотэатр «Чырвоная зорка» | Мастацкая кінакамедыя Меч і сэрца

Кіно «Спартак» | Усходні мастацкі фільм НАТЭЛА (Нявольніцы гарэма)

Пам. клуба МЕТАЛІСТАЎ (вул. Кірава, 12, тэл. 25-384) | Спектаклі смаленскага абласнога тэатра музкамедыі. Сёння, 15 студзеня, (пастаянная картка № 32) «КАТЯ ТАНЦОВЩИЦА». Пачатак роўна ў 8 гадзін вечара. Каса адкрыта з 12—2 гадз. і з 5 гадз. вечара.

Гукавы кінотэатр «Інтэрнацыянал» Ад 13 студзеня

Гукавы мастацкі фільм па раману А. Н. Остроўскага, вытворчасці «Ленфільм»

ГРАЗА

Рэжысер В. Пятроў.

У галоўных ролях: заслуж. арт. рэспубл. А. Тарасава, заслуж. арт. рэспубл. В. Масаліцінава, заслуж. арт. рэспубл. Карчагіна-Александроўская, Чувелеў і Зарубіна.

Усім арганізацыям Асоавіяхіма БССР

ЦС Асоавіяхіма БССР гэтым растлумачвае: усе члены Асоавіяхіма, якія жадаюць захаваць свой стаж,

абавязаны пакрыць запазычанасць

па членскіх узносах за ўсе ранейшыя гады.

Членам таварыства, якія пагасілі запазычанасць па членскіх узносах толькі за 1935 год, стаж улічваецца з 1935 года.

Запазычанасць па членскіх узносах за мінулыя гады і за 1935 год бярэцца па старой шкале.

ЦС АСОАВІЯХІМА БССР.

На падставе пастановы ЦВК і СНК СССР ад 28 лістапада 1935 года і загаду Наркамсоўгасаў СССР за № 600 ад 1 снежня 1935 г.

Менскі Саюзсвінаводтрэст з 1 студзеня 1936 г. ЛІКВІДУЕЦЦА.

Усе ўстановы і арганізацыі, якія маюць прэтэнзіі да трэста, павінны прад'явіць іх да 25 студзеня 1936 г. па адрасу: Менск, Совецкая 70, САЮЗСВІНАВОДТРЭСТУ.

Пасля ўказанага тэрміну ніякія прэтэнзіі прымацца не будуць.

ЛІКВІДКОМ.

Бабічская трактарная база рэчыцкага леапрамгаса праводзіць набор рабочай сілы, грузчыкаў, для пагрузкі лесаматэрыялаў.

Рабочыя забяспечваюцца інтэрнатам, паспельнымі прыладамі і паслугамі.

Зварачацца: ст. Бабічы, Зах. чыг.

ТРАКТАРНАЯ БАЗА.

ПАТРЭБНЫ прыбіральшчыцы і чорнарабочы

Зварачацца ў выдавецтва „ЗВЯЗДЫ", Совецкая, 63.

КУПЛЮ мужчынскі веласіпед.

Званіць па тэлефону 21-357 з 9 гадз. вечара.

АБАВЯЗКОВАЯ ПАСТАНОВА № 63

МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА СОВЕТА РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ

9 студзеня 1936 г. г. Менск.

„Аб забароне прадпрыемствам г. Менска карыстацца сірэнамі"

Менскі Гарадскі Совет Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў **пастанаўляе:**

Забараніць з 15 студзеня 1936 года ўсім прадпрыемствам, якія знаходзяцца ў г. Менску, падачу гудкоў сірэнамі.

Устанавіць, што гудкі сірэнамі могуць вытвярацца толькі як сігнал пры абвяшчэнні паветранай трывогі.

Вінаватыя ў парушэнні гэтай пастановы падвяргаюцца штрафу ў адміністрацыйным парадку да 100 руб.

Нагляд за выкананнем гэтай пастановы ўскладаецца на органы РС міліцыі гор. Менска.

Старшыня Менгорсовета Е. ЖУКОВІЧ.

Сакратар Менгорсовета КАЗЛОЎСКІ.

УКРАИНСКИЙ ЦЕНТРАЛЬНЫЙ ИНСТИТУТ ЭНДОКРИНОЛОГИИ и ОРГАНОТЕРАПИИ

Харьков ул. Дзержинского 10

ГЕМАТОГЕН

ДЕТСКИЙ в пастилках и для ВЗРОСЛЫХ в дражированных таблетках

ПРИМЕНЯЕТСЯ ПРИ МАЛОКРОВИИ УПАДКЕ ПИТАНИЯ, ЯВЛЕНИЯХ ИСТОЩЕНИЯ РАХИТЕ и НАЧАЛЬНЫХ ФОРМАХ ТУБЕРКУЛЕЗА

ПРОДАЖА во всех аптеках и магазинах спецтоваров СССР, а при отсутствии на местах высылается почтой

ТЭЛЕФОНЫ РЭДАКЦЫІ: Габінет рэдактара — 21-352. Габінет н. рэдактара — 25-168. Сакратарыят — 20-830. Прамысловы аддзел — 21-356. Аддзел мясцовай інфармацыі — 25-189. Партыйны аддзел — 21-353. Сельскагаспадарчы аддзел 21-846. Аддзел асветы літаратуры і мастацтва — 23-355. Аддзел пісем — 21-399. Загалачык выдавецтва — 21-358. Бухгалтэрыя — 21-845. Аддзел аб'яў і тыражны — 21-351. АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА: МЕНСК, Совецкая, 63.

Уп. Галоўлітбела № К—15. Друкарня газеты «Звязда», Менск, Совецкая, 63. Тыраж 106.045.